Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

Савецкая Беларусь

Органа Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 473. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц . . . . — 90 к. „ 3 „ . . . . 2 р. 70 к. „ 6 „ . . . . 4 р. — к. „ 1 год . . . . 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 30 к. мясцовая . . . . — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капітарнай шасьця тэксту — р. 50 к. За радок капітарнай пасьлядняй тэксту 1 р. — к. За радок капітарнай перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазволены. Зьмена тарыфу дазваляецца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант . . . 35 кап. За кожны дадатковы . . 15 „ Бесправолк. і чырвонаармейцы за дакумант . . . 15 „ За кожны дадатковы . . 6 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 71 (2560) Субота, 30-га сакавіка 1929 г.

УСЕСАЮЗНАМУ СТАРАСЬЦЕ М. І. КАЛІНІНУ—ШЧЫРАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ АД ПРАЦОЎНЫХ БССР.

Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту СССР і РСФСР тав. Калініну.

Дарагі Міхаіл Іванавіч!

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай Сацыялістычнай. Сав. Рэспублікі горача вітае Вас ад імя працоўных Беларусі з прычыны дзесяцігадовага прабываньня Вашага на пасту Старшыні Ўсерасейскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту.

Дзесяць год таму назад Камуністычная Партыя бальшавікоў па прапанове У. І. Леніна, высунула Вашу кандыдатуру на адказны пост Старшыні ЦВК.

Рабоча-сялянскія масы Савецкай краіны з энтузіязмам сустрэлі гэтую прапанову, зрабіўшы Вас сваім старастай.

Мінулыя дзесяць год жорсткай барацьбы і ўпартай працы рабочае клясы ў саюзе з сялянствам, пад кіраўніцтвам Ленінскай Камуністычнай Партыі, за захаваньне і ўзмацненьне дыктатуры пралетарыяту на перамогу сацыялізму, прайшлі пры непасрэдным Вашым удзеле ў барацьбе рабочых і кіраўніцтве гэтай барацьбой і работай.

Зьяўляючыся лепшым барацьбітом рэвалюцыі, адным з ветэранаў старай Ленінскай гвардыі, Вы, Міхаіл Іванавіч, па праву зазявалі сабе прызнаньне любімага правадыра і кіраўніка рабоча-сялянскіх мас Савецкага Саюзу ў іх барацьбе за сацыялізм

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР жадае Вам, дарагі Міхаіл Іванавіч, добрага здароўя і выказвае цьвёрдую ўпэўненасьць, што і ў далейшым Савецкі Саюз пры Вашым удзеле і кіраўніцтве будзе пасьпяхова вырашаць пастаўленыя перад ім задачы і перамагаць усе цяжкасьці на шляху пераможнага сацыялістычнага разьвіцьця.

Няхай жыве старая Ленінская гвардыя!

Няхай жыве лепшы з ленінцаў-бальшавікоў—Усесаюзны Староста. т. КАЛІНІН!

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ,

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР У. ІГНАТОЎСКІ.

29 сакавіка 1929 г. г. Менск.

Тайна „лісту Зіноўева" выкрываецца.

ХТО І ЯК ФАБРЫКАВАЎ „ЛІСТ".

БЭРЛІН, 28-3. Водлуг паведамленьняў бэрлінскага карэспандэнта агенцтва «Юнайтэд Прэс», бэрлінская палітычная паліцыя атрымала падрабязныя весткі аб акалічнасьцях, пры якіх быў сфабрыкаваны ў 1924 г. фальшывы «ліст Зіноўева».

Водлуг гэтых вестак, кіраўнічыя ангельскія ўстановы «перад парляманцкімі выбарамі ў 1924 г. даручылі прыняўшаму ангельскае грамадзянства ранейшаму царскаму генэралу Карнееву «здабыць матар'ял, які-б мог скампрамэтаваць у часе выбарчае кампаніі рабочую партыю». Карнееў зьвярнуўся да пражываючага ў Рызе ранейшаму царскаму афіцэру Пакроўскаму, які склаў праэкт «ліста Зіноўева»; у складаньні гэтага праэкту ўдзельнічалі ў якасьці «асьведамленых асоб» Арлоў, Гуманскі і інш. іх супольнікі. Пасьля таго, як ангельская разьведка ўхваліла праэкт, адна з копій «дакуманту» была паслана з Рыгі заказным лістом па адрасу савецкага паўнамоцнага прадстаўніцтва ў Лёндане. Адначасова лёнданскай вышуковай паліцыі была дадзена шыфраваная тэлеграма, якая паведамляла аб тым, калі павінен прыбыць у Лёндан гэты заказны ліст.

Лёнданская паліцыя перахапіла ліст і распачатала яго ў прысутнасьці сьведак, якія падпісалі пратакол наконт зьместу «перасылаемага дакуманту». Пасьля гэтага „ліст Зіноўева" быў перададзен у разьведку, а ў канвэрт, адрасаваны савецкаму паўнамоцнаму прадстаўніцтву, быў укладзен чысты ліст паперы; гэты канвэрт быў дастаўлен у паўнамоцнае прадстаўніцтва пачтальёнамі, «блізкімі да паліцыі». Усьлед за гэтым распачаліся «дыплёматычныя крокі» ангельскага міністэрства замежных спраў».

Дзе фабрыкаваліся фальшыўкі.

БЭРЛІН, 28-3. Бюлетэнь блізкага да паліцэй-прэзыдыуму агенцтва „Карэспандэнт" паведамляе, што ў Бэрлін прыбылі з Злучаных Штатаў фальшыўкі, якія былі ў свой час накіраваны супроць сэнатара Бора; у сучасны момант праводзіцца параўнаньне гэтых фальшывак з матар'ялямі, выкрытымі пры вобысках у Арлова і яго супольнікаў.

Водлуг слоў «Карэспандэнт», дасьледаваны каля 10 дакумантаў, прычым вынікі дасьледваньня не даюць падставы лічыць, што фальшыўкі, накіраваныя супроць Бора, былі сфабрыкаваны ў Бэрліне. Лічаць, што яны былі сфабрыкаваны ў Парыжы, прычым магчыма, што натхніцелямі гэтага падлогу былі ўсё-ж Арлоў і іншыя бэрлінскія падробшчыкі.

Запытаньне ў палаце вобшчын аб становішчы беларусаў і украінцаў у Польшчы

ЛЁНДАН, 26-3. Дэпутат ангельскае палаты вобшчын Малён зьвярнуўся да Чэмбэрлена з запытаньнем аб тым, ці мае намер Ліга Нацый зьвярнуць увагу на невыкананьне Польшчаю сваіх абавязацельстваў у адносіне беларускай і украінскай нацыянальных меншасьцяй і ці мае намер урад ужыць захады да таго, каб гэтыя абавязацельствы Польшчаю няўхільна выконваліся.

Чэмбэрлен адказаў, што не падзяляе думкі інтэрпэлянта, але калі будуць прадстаўлены матар'ялы, ён разгледзіць гэтую справу.

Дэлегацыя Ўсходняе Прусіі едзе ў СССР

БЭРЛІН, 28-3. 4 красавіка ў СССР выяжджае дэлегацыя Ўсходняе Прусіі. У ліку ўдзельнікаў дэлегацыі обэр-прэзыдэнт і обэр-бургомістр Кёнігзбэргу, старшыня сельска-гаспадарчае палаты і віцэ-старшыня гандлёва-прамысловае палаты. Перамовы, якія будзе весьці дэлегацыя, маюць на мэце дапамагаць разьвіцьцю гандлёвых дачыненьняў паміж СССР і Усходняй Прусіяй.

Рост варожасьці між Англіяй і ПАЗШ.

НЬЮ-ЁРК, 28-3. Як перадаюць, матрос, які затануў у часе патапленьня ангельскае шхуны з кантрабандай—францускі грамадзанін. Французкае пасольства патрабуе вестак. Водлуг паведамленьняў агенцтва «Асашэйтэд Прэс» у ангельскім гондурасе ўтварыўся надзвычайна варожы настрой у адносінах да грамадзян Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў. Консул Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў патрабаваў паліцэйскае варты. Пазыцыя канадзкага пасольства ў Вашынгтоне вельмі стрымана, але на ўсіх адзнаках пасольства мае намер дамагацца канчатковага вырашэньня пытаньня адносна таго, ці маюць права амэрыканцы захапляць канадзкія і ангельскія судны. Канфлікт, які ўзьнік у зьвязку з патапленьнем кантрабандзкага судна, ускладнае дачыненьні паміж Злучанымі Штатамі і Канадай, якія і без таго абвостраны канфліктам у зьвязку з незадаволенькем Канады павышэньнем тарыфаў з боку Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў. Друк Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў падкрэсьлівае неабходнасьць захаваць прыяцельскія дачыненьні з Канадай, у зьвязку з ростам варожасьці паміж Англіяй і Злучанымі Штатамі.

ПАСОЎВАНЬНЕ АМАНУЛЫ ДА КАБУЛУ.

ЛЁНДАН, 29-3. Агенцтва Рэйтэр паведамляе з Пэшавару: «Распаўсюдзіліся ўпартыя чуткі, што войска Аманулы ў аўторак пасунулася наперад па шляху да Кабулу. Хабібула выдаў загад аб канфіскацыі маемасьці сваякоў Аманулы, якія знаходзяцца за межамі Кабулу, калі яны ня вернуцца ў Кабул у працягу месяца».

УЗБРОЕНАЯ БАРАЦЬБА Ў КІТАІ.

III зьезд Гаміндану скончыўся.

Бегства дэлегатаў са зьезду.

ШАНХАЙ, 28-III. Скончылася праца 3-га зьезду Гаміндану. З заключнымі прамовамі выступалі Ху-Хан-мін і Чан-Кай-шы. Ху-Хан-мін заявіў, што зьезд адбыўся, наперакор прадказаньням, пасьпяхова. На зьезьдзе панаваў дух дэмакратыі, дэлегаты, меўшыя супярочныя погляды, падпарадкаваліся большасьці.

Кантонскія кітайскія газэты заяўляюць, што шмат якія дэлегаты спрабавалі пакінуць зьезд, аднак, пад націскам узброенае сілы, ім прышлося застацца ў Нанкіне. Усе нанкінскія дэлегаты ахоўваліся войскам, дакумэнты ўсіх выяжджаючых у Нанкін дакладна правяраліся вайсковымі, і такім чынам, толькі нямногім дэлегатам удалося ўцячы з Нанкіну. Гэтыя дэлегаты апавядаюць, што Чан-Кай-шы прапанаваў дэлегатам галасаваць за поўную рэвалюцыю. Шмат якія дэлегаты знаходзіліся пад наглядам вайсковае жандарэрыі.

Чан-Кай-шы ў сваёй прамове востра выступаў супроць гуансійскае групоўкі, заяўляючы: „Гаміндан і гуансійская групоўка ня могуць існаваць адначасова. Існаваньне аднаго азначае зьнішчэньне другога. Урад пастанавіў зьнішчыць гэтых фэадальных контр-рэвалюцыйных мілітарыстаў». Чан-Кай-шы адначасова выказаўся за неабходнасьць выкараненьня ўсіх груповак, якія ўтварыліся ўнутры партыі і патрабаваў спыніць нападкі з боку правінцыяльных аддзелаў партыі на правінцыяльнае будаўніцтва. Дэлегаты зьезду, водлуг паведамленьняў друку, вітаілі Чан-Кай-шы выгукамі: „Прэч гуансійцаў".

Туманны маніфэст зьезду.

ШАНХАЙ, 28-3. На заключным пасяджэньні 3-га зьезду Гаміндану ўхвален маніфэст, у якім вазначаецца, што Гаміндан і нацыянальны ўрад ужыўць усе захады да ажыцьцяўленьня праграмы Сун-Ят-Сэна «Тэорыя барацьбы за існаваньне, якая парадзіла капіталізм, імпэрыялізм і клясавую барацьбу,—гаворыцца ў маніфэсьце,—вылучаецца стрыжанем, наколькі якога разьвіваецца грамада Захаду. Аднак, у Кітаі ўмовы зусім супроцьлеглыя. Таму тут можна ўжыць толькі прынцыпы клясавае незалежнасьці і народных правоў». У маніфэсьце выкладаецца гісторыя рэвалюцыі ў Кітаі, прычым спамінаецца як аб паўночным паходзе, так і аб барацьбе з камуністамі. Маніфэст заклікае масы супрацоўнічаць з урадам у правядзеньні праграмы Сун-Ят-Сэна.

Узмацненьне рэвалюцыйнага руху.

ШАНХАЙ, 28-3. Агенцтва Рэйтар паведамляе аб значным узмацненьні актыўнасьці рэвалюцыйных атрадаў, кіруемых камуністамі, на паўночным захадзе Амой (дагаворны порт у паўднёвай частцы Фуцзянскае правінцыі). Асабліва ўзмоцненую актыўнасьць разьвіваюць паўстанцкія войскі ў райёне вялікага гораду Дзінчжоу (у паўднёва-заходняй частцы Фуцзянскае правінцыі, недалёка Фуцзянска-Цзянцзінскае граніцы). У гэтым райёне згуртавана 6 тысяч рэвалюцыйных атрадаў, камуністы вымазваюць узмоцненую дзейнасьць і ў Фучжоу (галоўны горад Фуцзянскае правінцыі). Правінцыяльная ўлада, водлуг слоў агенцтва Рэйтар, заклапочана ўтвораным становішчам, бо фуцзянскае войска нешматлікае і наогул не заслугоўвае давер'я.

Посьпехі рэвалюцыйнага войска.

ЛЁНДАН, 28-III. Шанхайскі карэспандэнт «Дэйлі Тэлеграф» паведамляе, што рэвалюцыйнае войска, пад кіраўніцтвам камуністаў, нанесла шмат паражэньняў урадаваму войску, якое вельмі слаба ў зьвязку з пасылкай новых часьцей Чан-Кай-шы ў лагчыну Янцзы. Лёнданскае місіянэрскае таварыства атрымала з Кантону тэлеграму, у якой паведамляецца, што горад Дзінчжоу (у паўднёва-заходняй частцы Фуцзянскае правінцыі) 27-га сакавіка заняты рэвалюцыйным войскам пад кіраўніцтвам камуністаў.

Пакараньне сьмерцю Лі Ці-сіна (?).

ШАНХАЙ, 28-3. Водлуг паведамленьняў чужаземнага друку, у Нанкіне па загаду Чан Кай-шы, пакараны сьмерцю лідэр гуансійскае групоўкі, ранейшы кантонскі дыктатар Лі Ці-сін.

Газэты адзначаюць, што весткі аб пакараньні сьмерцю афіцыйна не пацьвярджаны, аднак падкрэсьліваюць, што яны атрыманы з поўных крыніц. Газэты паведамляюць, што У-Цзэ гуй (прыхільнік гуансійскае групоўкі), даведаўшыся аб пакараньні сьмерцю Лі-Ці сіна, скончыў жыцьцё самагубствам.

Водлуг паведамленьняў кітайскага друку, Фын-Юй-сян распачаў мабілізацыю свайго войска. Ён заявіў, што хоць ён і пры хільнік міру, уоё-ж лічыць карную экспэдыцыю супроць гуансійскае групоўкі справядлівай, падпарадкаваўшы нацыянальнаму ўраду і дасьць яму неабходнае войска. Чан-Кай шы патрабуе ад Фын-Юй сяна пасылкі салдат у ліку 10 тысяч.

Заваротні генэралаў у вернасьці Нанкіну.

ПЭЙПІН, 28-3. У афіцыйных колах заяўляюць, што Чжан-Сюэ-ляя, Лі-Пін-сяя і Фан-Чэн-у хутка агалосяць абвестку тэлеграму, у якой заявяць, што падтрымліваюць нацыянальны ўрад і выкажуць надзею на хуткае прыпыненьне паўстаньня, узьнятага гуансійскай групоўкай. У тэлеграме будзе зазначана, што генэралы, падпісаўшыя яе, будуць падтрымліваць мір і парадак на тэрыторыі ім падпарадкаванай і пашлюць на загаду нанкінскага ўраду войска для ўдзелу ў карнай экспэдыцыі супроць гуансійскае групоўкі. Водлуг паведамленьня агенцтва Го-вэн, Лі-Ці-сян атрымаў сто тысяч даляраў ад Чан-Кай-шы. Лі-Ці-сян заявіў, што ён прыняў камандаваньне чатырма гуансійскімі дывізіямі, а таксама войскам генэрала Бай-І-сяна, які ўцёк разам з Бай-Цзун-чы і будзе падпарадкавацца загадам нацыянальнага ўраду.

Выключэньне лідэраў гуансійскае групы з Гаміндану.

ШАНХАЙ, 28-3. На заключным пасяджэньні зьезду Гаміндану выключаны з партыі лідэры гуансійскае групоўкі дэлегаты Бай-Цзун-Чы, Лі-Ці-сін і Лі-Цзун-Чжэн. Па пытаньні аб заможній паліцыі ўхвалена рэзалюцыя, у якой пацьвярджаецца пастанова першага зьезду Гаміндану аб зьнішчэньні варожых дагавораў. У рэзалюцыі аб унутрыпартыйным становішчы зазначаецца, што цяжкасьці ў шэрагах партыі выкліканы «блізасьцю камуністаў», барацьба з якімі не павінна спыняцца. Партыйныя арганізацыі заклікаюцца да падпарадкаваньня пастановам цэнтру, а члены партыі папярэджаюцца аб «імкненьні да ўлады».

У Саюзных Рэспубліках.

ГАНДАЛЬ СССР З МАНГОЛІЯЙ РАСЬЦЕ.

МАСКВА. 26 сакавіка ва Ўсесаюзнай Гандлёвай Палаце адбылося пашыранае пасяджэньне савету Палаты, на якім прысутнічалі старшыня малага курултаю Мангольскае рэспублікі Чой-Болсан, новы Мангольскі паўнамоцны прадстаўнік, члены ЦК народна-рэвалюцыйнае партыі Манголіі, гандлёвы прадстаўнік Манголіі ў СССР, кіраўнікі гаспадарчых арганізацый і іншыя. Загадчык аддзелу Ўсходу Наркамгандлю СССР у кароткім дакладзе аб гандлі СССР з Манголіяй вазначыў на надзвычайна спрыяючае разьвіцьцё за апошнія гады эканамічных узаемаадносін паміж абедзьвюма краінамі. Бліжэйшымі задачамі ў галіне гандлю з Манголіяй зьяўляюцца—пашырэньне асартыменту тавараў, экспартуемых у Манголію, разьвіцьцё экспартных апэрацый і г. д.

З прывітаньнямі выступіў член праўленьня Дзяржбанку т. Ірэвацкі, старшыня Цэнтрасаюзу т. Шэйн, старшыня ВОКС т. Каменева і іншыя. З адказам на прывітаньні выступіў т. Чой-Болсан. У заключэньне т. Лежава выказаў пажаданьне, каб працоўныя Манголіі пры дапамозе Савецкага Саюзу хутчэй і больш пасьпяхова пайшлі па шляху заваёвы сусьветнае культуры.

ВЫПЯРЭДНІЦТВА АКРУГАЎ ПА ПАДВЫШЭНЬНЮ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ.

ВАРОНЕЖ, 28-3. Райённыя і акруговыя зьезды саветаў ЦЧО распачалі выпярэдніцтва па падвышэньню ўраджайнасьці. Елецкі акруговы зьезд саветаў выклікаў Варонескі, Арлоўскі, Астракожскі і Курскі вокругі. Варонескі акруговы зьезд саветаў прыняў выклік, пастанавіў падвысіць у бягучым годзе прадукцыю сельскай гаспадаркі на 11,3 проц. і арганізаваць у калгасы 7 проц. усіх сялянскіх гаспадарак. Елецкі зьезд саветаў пастанавіў падвысіць ураджайнасьць у бягучым годзе ня менш, чымся на 10 проц. Варонескі зьезд саветаў выклікаў на выпярэдніцтва па падвышэньню ўраджайнасьці Тамбоўскі і Казлоўскі вокругі.

ПРЫМУСІЛІ КУЛАКОЎ ЗДАВАЦЬ ХЛЕБ.

НОВАСІБІРСК, 28-3. Прыклад саўлаўскіх сялян (Новасібірскі вокруг), якія вынесьлі пастанову аб абкладаньні кулакоў, у выпадку пляцячы хлебных лішкаў, самаабкладаньнем у пяць разоў больш, пачаў распаўсюджвацца па ўсёй Сібіры. У сяле Легастаева, Новасібірскага вокругу, пасьля вырашэньня агульнага сходу аб дадатковым самаабкладаньні, кулакі ў працягу 2-х дзён прывезьлі ў каапэратыў звыш 16 тон хлеба. У Мастоўскім таварыстве спажыўцоў загатоўкі адразу ўжо павялічыліся ў тры разы. У сяле Амтажынскім, Парабінскага вокругу, толькі трое кулакоў здалі каля 15 тон хлеба. Купрынскі зьезд саветаў, Новасібірскага вокругу пастанавіў ужываць вопыт заўлаўцаў у сваім райёне. Зьезд пастанавіў загатовіць да 15 красавіка звыш пляну яшчэ 3.500 тон хлеба. У сяле Знаменка Іркуцкага вокругу агульны сход пастанавіў спыніць памол збожжа на дзяржаўных млынох кулакам, злосна пездаючым хлебныя лішкі.

Аэрасані на падрыхтоўку пасеўнае кампаніі.

МАСКВА, 27-3. Кашырскі аўтадор (Маскоўскае губ.) распачаў цікавую справу. Ім арганізуецца двухтыднёвы прабег аэрасаняў і 3-х чырвоных фурманак для ўдзелу ў падрыхтоўцы сялянства да пасеўнае кампаніі. На санях устанаўляецца кіно-перасоўка. Удзельнікі прабегу будуць даваць злучэньні па сельска-гаспадарчаму падатку, мэдыцынскія парады, будуць раздаваць літаратуру да пасеўнай кампаніі і інш. Аэрасані наведаюць каля 70 сёл.

ЯЎРЭЙСКІЯ ПЕРАСЯЛЕНЦЫ Ў БІРА-БІДЖАНЕ.

МАСКВА, 28-3. Старшыня камэзэту Сьмідовіч у гутарцы аб выніках першага году працы ў Біра-Біджане адзначыў, што ня гледзячы на цяжкія ўмовы райёну, на зямлю асела звыш 500 перасяленцаў. Значны процант варочаўшыхся— вынікі недастатковае падрыхтоўкі апарату па абслугоўваньню перасяленцаў з прычыны кароткага тэрміну падрыхтоўкі. Улічваючы вопыт мінулага году, Камзэт скараціў раней намечаны плян перасяленьня да 1100 ардэроў. Зараз увага згрупавана на жыльлёва-дарожным будаўніцтве. Камзэт ужывае захады для досьледаў глебы ў райёнах. Можна са здаваленьнем адначыць, што пераважная форма гаспадаркі перасяленцаў—калгасы. Сёлета Біра-Біджан будзе мець 55 трактараў, у тым ліку 20 ужо высланых.

УсеЦСПС супроць павышэньня цэн.

Водлуг вестак, якія маюцца ў УсеЦСПС, бюджэтны набор за апошніх 6 месяцаў павысіўся ў сярэднім па СССР на 6,3 проц. Каапэрацыя павышае налічэньні на тавары, якія хоць і ня ўключаны ў бюджэтны набор, але фактычна ўваходзяць у кола тавараў шырокага спажываньня. Рост цэн выклікаецца вельмі часта самавольным павышэньнем налічэньняў у каапэрацыйнай сыстэме. АТЭ УсеЦСПС падаў у прэзыдыум УсеЦСПС прапанову высунуць перад НК Гандлем і перад Цэрабсакцыяй пытаньне аб узмацненьні рэгуляваньня налічэньняў і цэн. Пры мясцовых саветах прафсаюзаў павінны быць арганізаваны спэцыяльныя камісіі для тэрміновае праверкі налічэньняў у рабочых каапэратывах.

Узмацненьне хлебазагатовак у Татарыі.

КАЗАНЬ, 29-3. Абвешчаны ў Татарыі 3-хтыднёвік хлебазагатовак ужо даў значнае ўзмацненьне загатовак. На сельскіх сходах прымаюцца пастановы аб здачы дзяржаве ўсіх лішкаў. Дружнаму байкоту падпадаюць злосныя пэздачыкі. Пры актыўнай дапамозе беднаты і сераднякоў арганізавана шмат чырвоных абозаў.

Рост хлебазагатовак у Паволожжы.

САРАТАЎ, 28-3. 5-я пяцідзёўка сакавіка дала па краю павялічэньне хлебазагатовак у параўнаньні з мінулаю на 32 з палов. процанты. На першым месцы па выкананьню пляну ідзе рэспубліка немцаў Паволжжа, Балашоўскі і Пугачоўскі вокругі.

Рабочых ад варштату—на адказную працу.

СІМФЭРОПАЛЬ, 22-3. На пасаду намесьніка старшыні ВСНГ Крыму вылучан рабочы майстэрняў Севастопальскага порту тав. Каменеў. На пасаду намесьніка народнага камісара працы Керчанскага мэталюргічнага заводу—тав. Бодышаў.

Рабочыя змагаюцца з прагуламі.

НОВАСІБІРСК, 28-3. Старэйшыя рабочыя Краснаярскага чыгуначнага дэпо пастанавілі ўзяць шэфства над злоснымі прагульшчыкамі і піядыйнікамі і рашуча змагацца з «сабатажам». Рабочыя патрабавалі ад новых рабочых, каб яны ня кідалі працы да другога гудку, для чаго рашаюць не адчыняць марачных дошчак раней часу.

ПРЫВІТАНЬНІ М. І. КАЛІНІНУ.

Прэзыдыум Массавету--тав. Калініну.

МАСКВА, 28-III. У зьвязку з 10-цігодзьдзем знаходжаньня на пасадзе ўсерасейскага старасты, прэзыдыум Массавету паслаў т. Калініну прывітаньне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Міхаіл Іванавіч! У самы цяжкі год міжнароднае інтэрвэнцыі, гаспадарчае разрухі і нячуванага напружаньня рабочае клясы ў барацьбе за захаваньне і ўмацаваньне дыктатуры пралетарыяту і саюзу з асноўнай масай сялянства, быў ты абраны старшынёю Ўсерасейскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і з таго часу бяз зьмены стаіш на варце заваёў Кастрычніка, цьвёрда і выразна, з усёй энэргіяй бальшавіка, ажыцьцяўляючы заветы вялікага Леніна ў справе будаўніцтва сацыялізму на тэрыторыі шостае часткі зямнога кулі. Маскоўскі пралетарыят выказвае непарушную ўпэўненасьць, што і ў сваёй далейшай працы ты здолееш з такой жа энэргіяй і настойлівасьцю праводзіць цьвёрдую выразную і рашучую ленінскую палітыку, якая забясьпечвае поўную перамогу сацыялізму не толькі ў нашай краіне, але і ва ўсім сьвеце".

Прывітаньне ад Акадэміі Навук

ЛЕНІНГРАД, 28-3. Акадэмія Навук паслала наступнае прывітаньне т. Калініну: «Акадэмія Навук просіць Вас, глыбокапаважаны Міхаіл Іванавіч, прыняць яе гарачае павіншаваньне ў дзень 10 цігодзьдзя Вашае дзейнасьці на пасадзе старшыні УсеЦВК. Далучаючы сеньня свой голас да голасу прывітаньня ўсяго Саюзу, Акадэмія Навук ўспамінае Вашу сталую ўвагу да патрэб і інтарэсаў навукі і навуковых устаноў; яна ўспамінае таксама дні юбілею Акадэміі, калі Вы асабліва блізка падышлі да навуковага асяродку.

Акадэмія пасылае Вам пажаданьні доўгіх год працы на карысьць нашага Саюзу і будаўніцтва новага жыцьця. Картінскі, Альдэнбург».

Прывітаньне т. Калініну ад рабочых.

ЛЕНІНГРАД, 28-3. З прычыны 10 угодак знаходжаньня т. Калініна на пасадзе старшыні ЦВК СССР некаторыя фабрыкі і заводы грамадзкія і культурна-асьветныя арганізацыі паслалі яму прывітальныя тэлеграмы.

ЦК УсеЛКСМ аб правым і левым ухіле.

МАСКВА, 28-3. Пленум ЦК УсеЛКСМ ад нагодна ўхваліў рэзалюцыю аб унутры партыйным становішчы, у якой пленум ЦК УсеЛКСМ цалком і поўнасьцю салідарызуецца з лініяй ЦК УсеКП(б).

Пленум ухваляе, як мерапрыёмствы па ліквідацыі трацкісцкіх груп, якія сталі на той старане барыкад і спацыялісн да контррэвалюцыі, так і разгортваньне барацьбы з правым, адкрыта-апартуністычным ухілам, які яўляе ў сучасны момант галоўную небясьпеку для партыі і рэвалюцыі. Пленум адмятае ўсе апартуністычныя абвінавачаньні, высоўваемыя правымі супроць партыі і яе ЦК і ад асобы двох мілійённага камсамолу абацае партыі поўнае падтрыманьне ў абароне і правядзеньні яе генэральнае лініі—на разгортваньне індустрыялізацыі, на сацыялістычную перабудову сельскае гаспадаркі і выкарчоўваньне карэньняў капіталізму ў нашай краіне.

Рашучая барацьба з рознымі ўхіламі ад генэральнае лініі партыі і, асабліва—з адкрытым правым ухілам, так і з прымірэнцтвам, якое зьяўляецца прыкрытым, палахлівым апартуністам—складае ў сучасны момант галоўную задачу, выкананьне якое адна з неабходных умоў пасьпяховага разгортваньня сацыялістычнага наступу.

Асаблівая ўвага павінна быць згуртавана на спыненьні спробаў правых нарушыць ленінскую партыйную дысцыпліну—ад якіх бы „камуністычных сапоўнікаў" (Ленін) гэтыя спробы ня выходзілі. Пленум ЦК УсеЛКСМ выказвае цьвёрдую ўпэўненасьць, што ўвесь камсамол пранейшаму, як адзін чалавек, будзе цьвёрды ў сваім падтрыманьні бальшэвіцкае партыі, у адпоры розных атак на ня ленінскія пазыцыі. Пленум заклікае ўсе комсамольскія арганізацыі ўзмацніць барацьбу з правым ухілам у камсамоле. Камсамолу, які мае больш мырную, чымся партыя, сацыяльную базу, у большай ступені пагражае небясьпека ўхілаў ад ленінізму. На барацьбе з гэтымі ўхіламі будзем выхоўваць камсамольцаў у духу самазахаваньня адданасьці ленінізму.

Ангельская дэлегацыя ў Маскве.

МАСКВА, 28-3, 28-га сакавіка ў 10 гадзін раніцы са спэцыяльным поездам прыбыла ў Маскву дэлегацыя ангельскіх прамыслоўцаў. На вакзале дэлегацыю сустракалі прадстаўнікі Ўсесаюзна-заходняе гандлёвае палаты і прадстаўнікі прэсы. Дэлегацыя выручала з свайго складу арганізацыйны камітэт, у які ўвайшлі наступныя асобы: галоўны рэдактар часопісі „Інгліш Рэвью" пан Рэйнант, сэр Шэрвуд, які прадстаўляе фінансавую групу Сіці, Матэр—кіраўнік фірмы „Матэр і Плятт" (тэкстыльнае машынабудаўніцтва,) пан Хамільтон—старшыня Брокфордзкае гандлёвае палаты і прадстаўнік інтарэсаў іёркшырскае ваўнянае прамысловасьці пан Друмонд, пан Мэксон (асфальтавыя заводы і шляхавае будаўніцтва) і пан Куратос. Сакратаром камітэту зьяўляецца пан Джонс. Найбольш больш поўна прадстаўлена тэкстыльная прамысловасьць, гарбарная, машынабудаўнічая, сельска-гаспадарчае машынабудаўніцтва і г. д. Машынабудаўнічую прамысловасьць прадстаўляюць 27 членаў дэлегацыі, гарбарную прамысловасьць—10 членаў, тэкстыльную вытворчасьць—4 члены дэлегацыі. Іншыя члены дэлегацыі прадстаўляюць розныя выгляды ангельскае прамысловасьці. Некаторыя члены дэлегацыі, апрача сваіх прадпрыёмстваў, прадстаўляюць інтарэсы і маюць даручэньні ад іншых ангельскіх фірмаў. У бліжэйшыя дні, супольна з камітэтам дэлегацыі будзе распрацавана падрабязная праграма работ дэлегацыі ў СССР.

Прыём дэлегацыі.

МАСКВА, 28-3. 28-га сакавіка ўвечары старшыня савету Ўсесаюзнае Заходняе гандлёвае палаты т. Хінчук наладзіў прыём з прычыны прыезду ў Маскву дэлегацыі ангельскіх прамыслоўцаў.

На прыёме прысутнічала ангельская дэлегацыя ў поўным складзе, старшыня Дзяржбанку СССР тав. Пятакоў, старшыня праўленьня Цэнтрасаюзу т. Любімаў, намесьнік старшыні Цэнтрасаюзу т. Кізін, член прэзыдыуму ВСНГ тав. Аралаў, старшыня нафтасіндыкату т. Сакольнікаў, члены калегіі НК Гандлю СССР т. т. Шлейфэр і Мінкін, старшыня праўленьня Арэкса т. Аўралаў, старшыня праўленьня «Тэкстыльімпарту» т. Боеў, старшыня ВОКС т. Каменева, кіраўнікі трэстаў, сіндыкатаў і гаспадарчых арганізацый, адказныя супрацоўнікі НК гандлю СССР, ВСНГ, ВЗД, палаты і інш. На вечары з прывітальнымі прамовамі ад імя ўсесаюзнай заходняй Гандлёвай палаты выступіў т. Хінчук. З адказнымі прамовамі ад імя ангельскае дэлегацыі выступілі галоўны рэдактар «Інгліш Рэвью» ініцыятар падарожжа ў СССР пан Рэйнан і прадстаўнік ангельскіх колаў Сіці, адзін з кіраўнікоў дэлегацыі Шэрвуд Шоэф.

ТДА-АВІЯХІМ СССР АРГАНІЗУЕ ПОШУКІ ЭКСПЭДЫЦЫІ АМУНДСЭНА.

МАСКВА, 29-3. 25 сакавіка Нарвэскае тэлеграфнае агенцтва паведамляла, што лейтэнант Амундсэн, пляменьнік Роальда Амундсэна зьвярнуўся ў паўнамоцнае прадстаўніцтва СССР у Осло з просьбаю аказаць садзейнічаньне ў далейшых пошуках экіпажу самалёту «Латам». У зьвязку з гэтым генэральны сэкратар ТДА-Авіяхіму СССР Л. П. Маліноўскі ў гутарцы з супрацоўнікам ТАСС заявіў, што гэты зварот будзе ўлічан савецкаю грамадзкасьцю. ТДА-Авіяхім пастанавіў зьвярнуцца да адпаведных арганізацый з тым, каб усе экспэдыцыі і зьверабойныя судны, якія плаваюць у Паўночным акіяне, адначасова паставілі сабе задачай пошукі рэшткаў самалёту і экіпажу „Латам", на якім ляцелі Амундсэн і яго падарожнікі. Разам з тым, па дагаворанасьці з старшынёю Ўрадавае арктычнае камісіі т. С. С. Каменевым, зьяўляецца вусім магчымым паставіць гэту практычную задачу для адной з вялікіх савецкіх навуковых экспэдыцый, якая накіроўваецца наступным летам у Арктыку. Гэтыя экспэдыцыі змогуць адначасова шукаць загінуўшых з «Латама» і з дырыжабля «Італія».

Рэпрэсіі супроць камуністычных газэт.

ПРАГА, 26-3. Прысудам 2-ое інстанцыі зачынены на месяц камуністычныя газэты „Правда" на славацкай мове і „Мункаш" на вэнгерскай. Забарона гэтых газэт ставіцца ў сувязь з надыходзячай барацьбой сельска-гаспадарчых рабочых Славакіі за павышэньне зарплаты.

Рэгістрацыя чужаземцаў у Польшчы.

З 27 сакавіка ў Польшчы пачынаецца рэгістрацыя ўсіх чужаземцаў, якія жывуць на яе тэрыторыі. Ад рэгістрацы

Міхаіл Іванавіч КАЛІНІН

(ДА ДЗЕСЯТЫХ УГОДАК З ДНЮ АБРАНЬНЯ ТАВ. КАЛІНІНА СТАРШЫНЁЮ УсеЦВК).

Абраньне тав. Калініна Старшынёй УсеЦВК.

23 сакавіка 1919 году Міхаіл Іванавіч Калінін на пасяджэньні УсеЦВК быў абраны старшынёй УсеЦВК замест памёршага Я. М. Сьвярдлова. Кандыдатура тав. Калініна была падтрымана Ул. І. Леніным, які ў сваёй прамове сказаў наступнае:

«Неабходна, каб на чале савецкай улады стаяў таварыш, які мог бы паказаць, што наша пастанова ў адносінах да сярэдняга сялянства будзе кваўхільна праведзена ў жыцьцё. Знайсьці гэтнага таварыша трэба і магчыма. Гэтыя ўмовы задавальняе кандыдатура тав. Калініна—петраградзкага рабочага. Гэта таварыш, за якім ужо 20 гадовая партыйная праца, сам селянін Цьвярской губ., у яго ёсьць шчыльная сувязь з сялянствам і ён заўсёды падтрымлівае гэтую сувязь.

— Вось чаму,—скончыў Ул. І. Ленін сваю прамову,—кандыдатура гэткага таварыша, як Калінін, павінна аб'яднаць усіх нас; яна нам практычна дапаможа ў непасрэдных адносінах з цэнтральнай савецкай уладаю і з сярэднім сялянствам. Няхай вышэйшы прадстаўнік Савецкай Рэспублікі першы, пры агульнай дапамозе, пачне набываць практычны вопыт у гэтым пытаньні.

ГАНАРОВЫ ШЛЯХ.

БІАГРАФІЧНАЯ СПРАЎКА.

Міхаіл Іванавіч Калінін нарадзіўся 20 лістапада 1875 г. у сям'і селяніна ў вёсцы «Верхняя Тройца». Карчоўскага павету, Цьвярской губ. Дзіцячыя годы ён правёў у абставінах цяжкай працы, з раньніх гадоў дапамагаючы сям'і. Вучыцца Міхаіл Іванавіч пачаў на 10-м годзе. 13-ці год ён паступіў у валасную школу. За два гады свайго навучаньня Міхаіл Іванавіч прачытаў усю бібліятэку школы. Скончыўшы школу, ён паступіў хлопчыкам да абшарнікаў Балтоўскіх. Разам з Балтоўскім т. Калінін паехаў у Пецярбург.

У 1893 годзе, 18-ці год ад нараджэньня, Міхаім Іванавіч паступае вучнем на завод «Старый Арсенал» на Ліцейным праспэкце. Праз два гады Міхаіл Іванавіч—рабочы Пуцілаўскага заводу.

На Пуцілаўскім заводзе Міхаіл Іванавіч упяршыню пазнаёміўся з працаю нелегальных рэвалюцыйных гурткоў. Ён пачаў наведваць гэтыя гурткі, дзе адбываліся заняткі і гутаркі на палітычныя тэмы.

У 1898 годзе т. Калінін заснаваў сувязь з сацыял-дэмакратыяй і цалкам углыбіўся ў нелегальную працу. У гэты перыяд ён пачынае пісаць артыкулы на палітычныя тэмы; першыя яго артыкулы на гэтыя тэмы зьявіліся ў газэце „Рабочая Мысль», якая выдавалася ў той час. Рабочы рух пачаў пашырацца. У Пецярбурзе заснаваўся «Союз борьбы за освобождение рабочего класса». У лістападзе 1899 году за прыналежнасьць да гэтага саюзу Міхаіл Іванавіч у ліку іншых 52 чалавек быў арыштаваны і пасаджаны ў турму. У турме тав. Калінін прасядзеў 10 месяцаў.

Пасьля вызваленьня з турмы т. Калініну дазволілі паехаць у Тыфліс, дзе ён паступіў на службу ў чыгуначным майстэрні ў якасьці токара. У хуткім часе ў майстэрнях выбухнула забастоўка, пасьля якой Міхаіл Іванавіч у ліку іншых рабочых быў арыштаваны. Калі прышоў загад, які забараняў яму жыць на Каўказе, ён пераехаў у Рэвель. Гэта было ў красавіку 1901 году. Тут Міхаіл Іванавіч заснаваў сувязь з рабочымі, высланымі з Пецярбургу пасьля абухоўскай забастоўкі, з гурткамі самаадукацыі гімназістаў і з рэвалюцыйным студэнцтвам.

У студзені 1903 году тав. Калінін другі раз быў арыштаваны і перавезены ў пецярбурскую турму, дзе ён сядзеў 6 месяцаў. Пасьля адбыўшыхся тут непарадкаў тав. Калініна перавезьлі ў «Кресты». Праз месяц тав. Калінін у другі раз быў высланы ў Рэвель, дзе ён паступіў на завод Вольта. У 1904 годзе паліцыя яшчэ раз арыштавала т. Калініна і выслала яго на далёкую Поўнач у Павэні (Карэлія).

У сьнежні 1904 г. т. Калініну дазволілі выехаць на бацькаўшчыну. У вёсцы ён застаўся да верасьня 1905 г.

* * *

У 1905 годзе тав. Калінін вярнуўся ў Пецярбург, дзе ён на адным з першых нелегальных сходаў абвясьціў сябе бальшавіком. У гэты час была абвешчана амністыя, і т. Калінін паступіў на Пуцілаўскі завод. Ён прымае шчыльны ўдзел ва ўсіх рэвалюцыйных выступленьнях пецярбурскага пралетарыяту. У часе забастоўкі на Пуцілаўскім заводзе яго, як і ўсіх баставаўшых, звольнілі з заводу, і ён выяжджае ў вёску. Праз 4 месяцы т. Калінін ізноў вярочаецца ў Пецярбург і паступае на патронны завод на Васільеўскім Востраве. Ён тады вёў актыўную рэвалюцыйную працу—быў членам праўленьня саюзу металёўцаў і членам партыйнага камітэту.

У 1906 годзе тав. Калінін быў дэлегаваны пецярбургскай арганізацыяй на Стакгольмскі зьезд партыі. У 1907 годзе ён, ня гледзячы на перыяд рэакцыі і заняпад рэвалюцыйнага руху, цалкам аддаецца партыйнай і прафесыянальнай працы. У 1910 годзе тав. Калінін быў ізноў арыштаваны і высланы. Ён паехаў у вёску і прабыў там цэлы год. З 1913 году т. Калінін пасьлядоўна працаваў на вайсковым заводзе і на заводзе „Айваз". Пасьля абвяшчэньня імпэрыялістычнай вайны ён выступіў, як паражэнец, арганізуючы рабочых супроць вайны.

Да гэтага часу арганізацыя бальшавікоў узмацніла сваю працу. Тав. Калінін зьяўляецца кіраўніком гурткоў рэвалюцыйнай працы. Чарговы арышт Міхаіла Іванавіча адбыўся 8 студзеня 1915 году. У турме ён прасядзеў цэлы год. Яму была прызначана высылка ва Ўсходнюю Сібір на ўвесь час ваеннага становішча. Ад гэтай высылкі яго пазбавіла лютаўская рэвалюцыя.

У лютаўскай рэвалюцыі т. Калінін прымаў самы актыўны ўдзел.

* * *

Пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі тав. Калінін быў вылучаны на пасаду гарадзкога галавы Петраграду. Ён тады заняў кіруючую пасаду ў бальшавіцкай партыі. У 1919 годзе тав. Калінін быў абраны членам ЦК УсеКП(б). Пасьля сьмерці першага старшыні УсеЦВК Я. М. Сьвярдлова, яго месца заняў тав. Калінін.

Маладая Савецкая Рэспубліка была абкружана ворагамі. Улада на мясцох была няўстойлівая і слабая. У гэты час т. Калінін разам з шэрагам практычных працаўнікоў падарожнічае па ўсёй краіне. Тав. Калінін дае мясцовым установам дырэктывы і зазначэньні цэнтру, вучыць працаваць па новаму. Па дарозе ён вырашае тысячы спраў, здавальняючы хадайніцтвы і выслухоўваючы розныя скаргі. Міхаіл Іванавіч зрабіў больш 20 падарожжаў. Ён аб'ехаў Калчакоўскі і Заходні фронты, Турк-фронт, фронт Дэнікіна і, урэшце, фронт Юдэніча каля Петраграду. У 1920 годзе Міхаіл Іванавіч падарожнічае па мясцох пакінутых Урангелем і зруйнаваных белагвардэйцамі. Ён аб'ехаў казацкія станіцы, рабочыя райёны Украіны. Кубань і Сібір. Усюды ён займаецца пытаньнямі гаспадарчага і савецкага будаўніцтва.

У 1921—22 г. г.—годы неўраджаю—тав. Калінін аб'ехаў галодныя месцы.

З 1923 году т. Калінін кандыдат, а з 1925 году—члена Палітбюро ЦК УсеКП(б).

10 год на пасадзе Усесаюзнага Старасты.

За апошнія гады нацыянальнасьці, насяляючыя Савецкі Саюз, аформіўшыся ў асобныя нацыянальныя рэспублікі і вобласьці, у агульнай сыстэме СССР, пад кіраўніцтвам партыі і савецкае улады разьвіваюць сваё гаспадарчае і культурнае будаўніцтва ў напраму ўзмацненьня іх сацыялістычных асноў. Выявіліся ўжо месца і ўдзельная вага кожнага з нацыянальных аб'яднаньняў у складзе СССР. Некаторыя з гэтых рэспублік па абхвату свайго гаспадарчага разьвіцьця перавысілі даваенны ўзровень, а ў частцы іх, дзе раней ня было амаль ніякае прамысловасьці і электрыфікацыі, пачынаюць цяпер разьвівацца і гэтыя галіны. У галіне культурнага будаўніцтва нацыянальнымі рэспублікамі дасягнуты яшчэ большыя посьпехі. Шэраг нацыянальных аб'яднаньняў, дзе да рэвалюцыі амаль ня было школ, і насельніцтва было пагалоўна нпісьменнае, узьнімаюцца зараз да ўзроўню разьвіцьця расейскай часткі насельніцтва.

Правядзеньне ленінскае лініі ў нацыянальным пытаньні і дасягненьні ў гэтай галіне ў значнай ступені зьвязана з дзейнасьцю М. І. Калініна, як старшыні ЦВК СССР і РСФСР—нашага Усесаюзнага Старасты. Міхаіл Іванавіч, як адзін з верных вучняў Леніна, улічваў усё значэньне необходнасьці правільнага вырашэньня нацыянальнага пытаньня ў нашай многанацыянальнай краіне, таксама як правільна ён улічваў заўсёды асноўнае значэньне для рэвалюцыі неабходнасьць захаваньня моцнага саюзу паміж пралетарыятам і працоўным сялянствам. М. І., між іншым, у адным з сваіх выступленьняў выказаўся адносна гэтага наступным чынам:

„Пытаньні нацыянальныя я аднаму да парадку сялянскіх. Гэтым пытаньням Уладзімір Ільліч аддаваў значную ўвагу, і гэта зусім натуральна, калі ўспомніць, што ўся Расея зьяўляецца краінаю многанацыянальнаю, розпакоўнаю; народы, насяляючыя яе, знаходзяцца на розных ступенях разьвіцьця, што ўжо само па сабе ўносіць адчужэньне паміж народамі, бо больш культурныя народы ў буржуазнай грамадзе амаль няўхільна зьяўляюцца эксплеататарамі больш адсталых народаў, калі ня проста, дык у кожным выпадку ўкосна».

Поруч з гэтым Міхаіл Іванавіч адзначае ўсю важнасьць правільнага вырашэньня нацыянальнага пытаньня для рэвалюцыі, улічваючы адначасова ўсю яго складанасьць. Адносна гэтага ён гаворыць:

«Толькі зараз, калі абудзіліся шматлікія нацыянальнасьці, што насяляюць наш Саюз, мы пачынаем разумець выключную цяжкасьць гэту, правесьці сапраўдную, інтэрнацыянальную, г. зн. аднаведную, дапамагаючую міжнароднай рэвалюцыі лінію. І зразумела тая ўвага, якую аддавай т. Ленін нацыянальнаму пытаньню, ад умелага вырашэньня якога ў значнай ступені залежыць лёс рэвалюцыі».

У дакладзе сваім 3-му Ўсесаюзнаму Зьезду Саветаў па савецкаму будаўніцтву Міхаіл Іванавіч, спыняючыся на нацыянальным пытаньні, поруч з дасягненьнямі адзначаў недахопы па гэтай лініі, прапанаваў «захоўваць ня толькі тыя народнасьці, якія па сваёй колькасьці ўжо зьяўляюцца рэспублікамі, а ў нас ёсьць рэспублікі, якія налічваюць у сябе ня больш 200 тыс. жыхароў, значыцца, вы бачыце, большмеш у нас гарантаваны ўсе народнасьці». Далей ён прапануе зьвярнуць увагу і на нацменшасьці, насяляючыя ў сваю чаргу гэтыя нацыянальныя рэспублікі (украінцы, расейцы, татары і г. д.)

Пры жывейшым і актыўным удзеле М. І. афармілася ўтварэньне асобных нацыянальных савецкіх аўтаномій і вызначылася лінія далейшага іх разьвіцьця. Пры яго-ж бліжэйшым удзеле распрацоўвалася канстытуцыя Саюзу ССР. Сыстэма Саюзу ССР за мінулыя гады існаваньня зусім сябе апраўдала, як найлепшая дзяржаўная форма, якая можа забясьпечыць цесны саюз працоўных асобных нацыянальнасьцяй, пасьпяховае правядзеньне сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне і ўзмацніць адзінства нашае сілы ў барацьбе з агульнымі ворагамі.

Падыходзячы да вырашэньня нацыянальнага пытаньня, Міхаіл Іванавіч не пакідаў бяз увагі і небаходнасьці правядзеньня клясавае лініі і ў гэтым пытаньні. Разьбіраючы пытаньні асобных рэспублік і вобласьцяў, ён заўсёды ўмеў разабрацца ў клясавай сутнасьці гэтых пытаньняў і пры вырашэньні іх усімі спосабамі бараніў інтарэсы рабочых і працоўных сялянскіх мас супроць эксплеататарскіх пластоў насельніцтва гэтых нацыянальнасьцяй.

За апошнія гады М. І., аб'яжджаючы некаторыя райёны Савецкага Саюзу, між іншым пабываў у Грузіі, Туркестане, Башкірыі і ў некаторых іншых рэспубліках. Усюды ў гэтых рэспубліках ён у першую чаргу наведваў вёскі, аулы і пачлакі, для таго, каб непасрэдна пазнаёміцца з бытам і жыцьцём мясцовых сялян, праводзіў з імі гутаркі, задаючы пытаньні, якімі надзвычайна цікавяцца сяляне, і даваў адпаведныя вырашэньні гэтым пытаньням. У думцы М. І., незалежна ад нацыянальнасьці, заўсёды на першым месцы стаяць інтарэсы рабочых і працоўных сялянскіх мас. Вось чаму Міхаіл Іванавіч, як старшыня ЦВК СССР і РСФСР, зьяўляецца агульнапрызнаным старастай працоўных усіх нацыянальнасьцяй СССР.

У дзень 10-гадовага юбілею дзейнасьці на пасадзе старшыні ЦВК і ЎсеЦВК Міхаіла Іванавіча, пажадаем яму далейшай карыснай працы ў напраму дасягненьня яшчэ большых посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве нашай краіны і на лініі ўзмацненьня саюзу паміж пралетарыятам і працоўнымі ўсіх нацыянальнасьцяй, насяляючых Савецкі Саюз.

Т. Рыскулаў.

ЁН НАШ---ЁН ДАСЬЦЬ ПАРАДУ...

Нібы бязупынная, доўгая стужка цягнецца чарга людзей, людзей, якія сабраліся з усіх канцоў Савецкага Саюзу. І здаецца, што ня будзе канца гэтай стужкі. Спыніцца недзе наперадзе на некалькі хвілін і зноў паўзе далей і далей.

— Ня прыме, не пасьпее,—чуюцца галасы нэрвова настроеных хадакоў, якія стаяць ў чарзе.

А ў гэты час, за бар'ерам стаіць невялікага росту чалавек з барадою-клінушкам, у акулярах, у цёмна-сінім гарнітуры і неяк па-бацькаўску сардэчна апытвае кожнага падыходзячага да яго. Гэта Міхаіл Іванавіч Калінін, як проста называюць яго.

Тут выказваюцца скаргі, крыўды, просьбы.

Прастату, рашучасьць Міхаіла Іванавіча ведае не адзін хадок. Відавочна гэтым і тлумачыцца няўхільны рост колькасьці зьвяртаючыхся да яго. Што-б ні здарылася, якое-б ні здарылася гора—да Міхаіла Іванавіча. Ён наш, ён па-нашаму, па-мужыцкаму разьбірае, дасьць параду.

— Так ты гаворыш, што ў калгасе табе жыцьця не даюць: хто-ж гэта?—пытаецца т. Калінін.

— Ня ладжу я з старшынёю арцелі,—адказвае хадок, селянін арцелі—Красный Труд т. Крылоў з Льгоўскае акругі

— З-за чаго-ж гэта ў вас вядзецца?

— Як з-за чаго? Павыку атрымалі—прашу, не даюць, падаткам пачалі абкладаць—на мяне першага, а сабе нічога, а я што ні на ёсьць сапраўдны пралетарыі, бядняк; казалі, што па закону на такіх падатак не накладаюць. Пытаюся, Ягора Фроловіча, гэта нашага старшыню—чаму? Гэта так па закону—гаворыць. Тыкнуў пальцам у кніжку, чытай гаворыць. А які я чытальшчык—аза ў вочы ня ведаю. Ніверна,—кажу,—нутром чую, што ня так. Ты што-ж гэта, гаворыць законам падначаліцца не жадаеш, у арцелі ня хочаш быць. Думаю, паеду я лепш да нашага старасты, ён законы падпісвае, ён растлумачыць.

Паглядзеў Міхаіл Іванавіч на Крылова, адразу неяк падумаў.

— Пачакай—гаворыць яму т. Калінін—напішу паперу ў акругу, пашлю камісію, праверыць.

А хадок нахіліўся да вуха Міхаіла Іванавіча і шэпча:

— Сам старшыня—та Касьянаў да рэвалюцыі 30 дзесяцін першагатунковай зямлі меў, я ў яго ў работніках жыў; у грамадзянскую вайну замест таго, каб бараніць Савецкую ўладу, спэкуляцыяй займаўся.

— А як жа ў арцель вы яго прынялі?

— Як? Нас двох чудакоў туды ўсадзілі і зацьвердзілі, што вось арцель па нашаму жаданьню арганізавалася.

— Добра, пасядзі. Выклічу, асобна пагаворым—канчае з ім т. Калінін...

Напісаў М. І. у Льгоўскі акрыканком паперу, прапанаваў пасьлаць на дзейнага таварыша, праверыць працу старшыні калгасу—«Красный Труд» гр. Касьянава.

А адтуль праз два тыдні тэрміновы адказ:

«Большасьць абвінавачаньняў, выкладзеных у скарзе Крылова, пацьвердзіліся».

І больш таго, выявілася наступнае:

„Фактычны кіраўнік сельска-гаспадарчае арцелі «Красный Труд»—Касьянаў у мэтах нажывы сьвядома прыпыняў аграмаджаньне сродкаў і прыкладаў вытворчасьці ў арцелі, скарыстоўваючы крэдыты не па назначэньню. Забраў сабе незаконна 125 руб. Разьмеркаваў арцельных коняй у адзіноасобнае карыстаньне і г. д. У адносінах да членаў арцелі трымаў сябе дэспатычна, ужываў пабоі і пагражаў забіць Крылова. Незаконна выключыў з арцелі Крылова"...

У выніку расьсьледаваньня Касьянаў быў аддадзены пад суд.

В. Белаў.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Крахмальны завод дапамагае беднаце.

(Крупіцкі сельсавет, Самахвалавіцкага райёну, Меншчына).

На тэрыторыі савгасу «Аннопаль» працуе крахмальны завод Белхартрасту, які пабудован на руінах крахмальнага заводу быўшага пана. Распачаў працу ён па вырабу крахмалу з часу адходу палякаў, і за час існаваньня значна пашырыўся выраб сыравіны і аўтарытэт сярод вакольнага насельніцтва. Як толькі пачынаецца капаньне бульбы ў вёсках, цэлыя абозы сялянскіх падвод стаяць каля канторы заводу, здаючы прывезеную бульбу; і так прыблізна аж да палавіны зімы. Толькі к вясьне спыняецца рух сялянскіх падвод. Перарабіўшы бульбу і вылучыўшы з яе крахмал, завод па таннай цане (50 кап. воз) прадае бяднейшаму сялянству сурагат ад вырабу крахмалу, які купляецца сялянамі ахвотна.

Вялікая праца праведзена заводам па паляпшэньню дабрабыту сялянскай гаспадаркі, асабліва бядняцка-серадняцкай. Заводам праводзіцца кантрактацыя дабраякаснай, прыстасаванай да нашых умоў бульбы сярод сялянства, што павялічыла плошчу засеву бульбы і ўраджайнасьці.

Прадаецца па таннай цане торф бяднейшаму насельніцтву, інвалідам некаторым адпускаецца дарэмна. Распрацоўка вядзецца самім заводам. Шмат беднаты спасае завод ад бяскорміцы, што дае магчымасьць селяніну трымаць больш скаціны ў гаспадарцы і ня збываць на базары за бязцэнак. Шмат беднаты ходзяць з вакольчых вёсак на падзённую работу ў завод—торфараспрацоўку, што значна зьмяншае беспрацоўе.

А. Р.

Праца ідзе, а шэфы сьпяць.

(Барысаўшчына).

Падрыхтоўчая праца да сяўбы з кожным днём узмацняецца. Па сёньнешні дзень ачышчана 52 проц. пасеўнага матар'ялу.

Разгарнулася шырока праца па падняцьцю ўраджайнасьці па ўсяму райёну і ў гэту працу ўцягнуты ўсе грамадзкія сілы вёсак.

Студэнты апошняга курсу С.-Гаспадарчага Тэхнікуму ўсе мабілізаваны ў дапамогу парт'ячэйкам, як КСМ і с.-с. Камсамол у бліжэйшы час наладжвае массавы паход за ўраджай.

У райёне адбылося цэлы шэраг камсамольскіх сходаў, селькораўская нарада і канфарэнцыя настаўніцтва, на якіх абгаварвалі пытаньне аб падняцьці ўраджайнасьці і ўдзеле ў пасеўкампаніі. Зараз праца праводзіцца ў вёсках і мае станоўчыя вынікі.

Вялікую ролю адыгрываюць с.-гаспадар. установы. Да апошняга часу для беднаты нарыхтавана 2431 пуд рознага насеньня, разгортваюць працу кредытныя таварыствы ў справе забясьпечаньня насеньнем. СК Узаем. маюць да 3000 пудоў уласнага насеньня. Арганізоўваюцца ў часе пасеўкампаніі 5 паходных кузьняў. У сучасны момант на с.-с. ідзе спэцыяльная арганізацыя дружын па апрацоўцы бяконным удовам зямлі, беднаце і сем'ям чырвонаармейцаў, якія ня маюць сваіх коняй.

Наогул, падрыхтоўка да сяўбы праходзіць здавальняюча.

Як-жа рыхтуюцца да гэтай вялікай справы шэфы? Трэба сказаць, што шэфы сьпяць.

За ўвесь час праведзена толькі нарада шэфаў, на гэтым і скончылася праца.

Трэба шэфам падцягнуцца.

Ал. Станкевіч.

Затрымаем беднату ў школах.

У сёлетнім навучальным годзе пятыя групы сямігодак гор. Амсьціслаўля (Аршанская акр.) укамплектоўваліся пад лёзунгам „больш беднаты і батрацтва ў школу". У другой палове навучальнага году паўстала пытаньне аб тым, як затрымаць гэту беднату ў школах, калі пачнецца разводзьдзе і бязхлебіца. Першы пачын паклала сама дзяржава, якая адпусьціла на чатыры сямігодкі каля 550 рублёў.

Пры кожнай сямігодцы склаліся камісіі дапамогі беднаце.

На першым пасяджэньні камісіі пры І сямігодцы вызначылі плян працы: у нядзельнікі расьпілаваць школьныя дровы, што дасьць больш 20 руб., наладзіць платныя вечары-спэктаклі, правесьці кампанію з падпісным лістом.

Другая і трэцяя сямігодкі ўжо правялі спэктаклі, якія далі па некалькі дзесяткаў рублёў.

Архінаў.

Рабочыя брыгады ў падрыхтоўцы да сяўбы

Гомель, 27-3. Камсамолія Гомельшчыны прыняла выклік Менску па арганізацыі рабочых брыгад для ўдзелу ў веснавой пасеўнай кампаніі. На буйных прадпрыёмствах акругі ўжо арганізаваны брыгады, якія ў бліжэйшыя дні выяжджаюць у розныя селішчы акругі для вядзеньня растлумачальнай працы сярод насельніцтва, рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару і аказаньня дапамогі бяднацкім сем'ям. Рабочыя заводу «Пралетары» сабралі да 100 руб. для набыцьця быка-вытворца. Чыгуначнікі ўзбудзілі хадайніцтва аб прадастаўленьні вагону для арганізацыі перасовачнай рамонтнай майстэрні па лініі Гомель—Хойнікі.

Трэба ўзмацніць кіраўніцтва.

Азяранская ячэйка КПБ (Рагачэўскі р., Бабруйшчына) арганізавала ячэйку бязбожнікаў, у якую ўвайшло 39 чалавек. Бюро вызначыла плян працы на бліжэйшы час.

Пры В.-Крушынскім сельсавеце таго-ж райёну склаўся гурток бязбожнікаў. Заняткі ячэйкі і гуртка адбываюцца раз у два тыдні па падручніку Яраслаўскага. Выпісваецца 10 экзэмпляраў газэты «Бязбожнік».

Райсавет саюзу бязбожнікаў павінен узмацніць кіраўніцтва вясковымі ячэйкамі, дасылаючы сталыя праграмы для працы антырэлігійнікаў на вёсцы.

Я. Крушына.

Як ашчадная каса выручыла мяне з бяды.

На горкім вопыце я пераканаўся я ў неабходнасьці, каб кожны чалавек меў чырвонец, другі, а яшчэ ляпей, каб сотню, другую, на ўсякі няшчасны выпадак у жыцьці.

Дапаможа нам гэта зрабіць дзяржаўная каса ашчаднасьці Як прыклад я скажу, што пачынаючы з 1924 г. я рабіў невялікія ўклады у сваю мясцовую касу ашчаднасьці. У 1927 г. у зьвязку з ліквідацыяй прадпрыемства, на якім я працаваў, я стаў беспрацоўным. Як б. настаўнік я быў залічан вольным слухачом Менскіх шасьцітыднёвых настаўніцкіх курсаў.

Не атрымліваючы пэнсіі і ня маючы сродкаў, я стаяў перад пытаньнем кінуць курсы не дабыўшы да канца.

Але тут мне прышла на дапамогу Менская Цэнтральная Каса ашчаднасьці, даўшы мне сродкі з маіх невялікіх укладаў і толькі дзякуючы гэтаму выпадку я дабыў да канца курсаў.

Настаўнік Пляшчун Я.

У ПРЫЁМНАЙ УСЕСАЮЗНАГА СТАРАСТЫ.

352014—лік хадакоў, якія пабывалі за апошнія пяць год у Ўсесаюзнага старасты М. І. Калініна ў Маскве, у яго прыёмнай.

Кожны дзень па некалькі сот, а часамі і да тысячы сьцякаюцца з усіх канцоў Савецкага Саюзу да Калініча хадакі. Яшчэ з самай раніцы ля Дому Саветаў, што на рагу Махавой і Вазьдзьвіжанкі, стаіць, чакаючы ўпуску ў прыёмную, самы разнашорстны натоўп.

У ім вы знойдзеце і пізкарослага, каранастаў, шырокаскулага з вузкімі ледзь значнымі вочкамі—бурата, і вусатага украінца, і гарбаносага, чорнага як смоль армяніна, і стройнага чаркеса, і акуратна ўбранага строгага калёніста з АССР немцаў «Паваложжа», і разанскую жанчыну.

У пачаканьні вядуць гутаркі, інфармуюць адзін аднаго пра жыцьцё райёнаў, адкуль прыехалі; тут своеасаблівая жывая газэта ўсесаюзнага маштабу. Рознавіднасьць просьбаў і скарг такая вялікая, што іх нават не заўсёды могуць ахапіць існуючыя ў нас Наркаматы. Прыёмная М. І. Калініна сапраўды ўяўляе сабой у мініятуры сход усіх існуючых саюзных рэспубліканскіх наркаматаў.

А 8 гадз. 30 хвіл. адчыняюцца дзьверы прыёмнай. Гуськом-зьмейкай уліваецца ў вялікую залю натоўп.

Роўна а 10 гадз. раніцы пачынаецца прыём хадакоў.

—Прышоў, прышоў!—чуюцца галасы. Некаторыя, якія ніколі ня бачылі хаўкі і праз галовы разглядаюць невялікага росту чалавека ў сіняй тройцы, чалавека, злучыўшага ў сабе заводзкага рабочага і простага селяніна, стаўшага воляю шматміліённага народу іх старастаю.

— Міхаіл Іванавіч, бацька родны, заступіся, пакрыўдзілі!

— Хто-ж і за што цябе пакрыўдзіў?

— Зямліцу! Апошнюю зямліцу адбіраюць! Пры царызьме было—нічога, а цяпер і ад гэтай адарваць хочуць. Ёсьці ня будзе чаго.

— А колькі-ж у цябе зямлі?

— У мяне? Паўдзесяціны на едака. А душ—восем.

— А ўзяць колькі хочуць?

— Хто іх ведае. Ды я клапачуся ня толькі аб сабе—я ад грамады. Паўнамоцтва ёсьць.

— Дык гэта трэба было-б вам спачатку праз зямельную камісію старацца. Вы там былі?

— Не! Чаго нам туды зварочвацца—там іхныя сват ды брат сядзяць, на нас ніякай увагі не зьвяртаюць. У цэнтры лепш вырашаюць.

— Ну, добра. Што з табою зробіш. Ты адкуль прыехаў?

— З Кузнецку, мы раней Хвалынскія былі, Саратаўскай губ.

— Пасядзі,—канчае з ім гутарку М. І. Калінін,—вызавуць асобна.

Хадок адыходзіць, сьціскаючы ў руках свае паперы, угыб залі, а на зьмену яму падыходзіць завязаная вялікаю хусткаю жанчына. Парыўча падае паперы і стаіць, выціраючы кулаком падаючыя з вачэй буйныя сьлёзы.

— Адкуль прыехала?

— Пензенская!

— Чаго-ж ты хочаш?

— Мужа забралі ў турму.

— За што?

— Я і сама ня ведаю.

— Як-жа ты ня ведаеш? Мужа пасадзілі і ня ведаеш за што, а едзеш памілаваньня прасіць.

— Пабіў ён мяне. Ну, а як стаў біць—да суседкі, а тая і кажа: пайдзі ў міліцыю—скажы, няхай напалохаюць—сунімецца. я міліцыянэру ўсё расказала, а ён мужа—у лазьню, ноч пратрымаў, а раніцай—у горад. Глянь—паглянь, а яму там шэсьць месяцаў, як адзін дзенёк—у мяне дзеткі.

— І часта б'е ён цябе?

— Не, калі выпіўшы—д'ябал, не падыходзь, а калі цьвярозы—золата, а не чалавек.

— Ну, вось вас і разьбары. Выклічам.

Жанчына адыходзіць.

— Я селькор,—рэкамэндуецца бязвусы хлапец з адной рукою,—у нас, у Смаленскай губэрні, в пэнсіяй інвалідам ня ладна: гандляры пэнсію атрымліваюць, а беднята ў загоне, загадайце каму належыць расьследаваць.

— Міхаіл Іванавіч, бяда!—зварочваецца зусім сівы старац,—я і так у зямлю гляджу, а закон ваш проста такі ў магілу гоніць. Унучку з дзяцінства выхоўваў, разам жылі, як меў сілу, сам працаваў, а цяпер—неў магату. Прымака хацеў узяць, унучку замуж выдаць, хлапца добрага знайшла і вось—ня легіструе савет, гаворыць—унучцы тваёй васямнаццаці гадоў няма, па закону нельга. Мне—пятля, а тут табе закон. Нікуды нягодны...

— Несправядліва падаткам цяпер абклалі. Летась плацію 17 руб. 34 кап., а зараз 122 руб. Адно разарэньне, гаспадарку хоць кідай—жаляцца другія.

Але поруч з гэткага роду хадакамі бываюць і іншыя.

З Рассашанскае акругі Ц.Ч.О. прыехала грамадзянка хадайнічаць аб памілаваньні мужа.

— Бязьвінна асуджан, — жаліцца яна М. І.

— За што-ж?

— Па 116 арт. Крымінальнага Кодэксу.

— Гэта за што-ж?—яшчэ раз пытаецца Міхаіл Іванавіч.

— Маленькая нястача была ў каапэратыве, не па яго віне.

— Ну, колькі-ж?

— 1600 руб.

— Якая-ж маленькая?! Гэтага, бадай, увесь каапэратыў ня варты. А на колькі яго асудзілі і калі?

— На два гады, два тыдні таму назад.

— Не, памілаваць не магу.

— Ды суд-жа пастанавіў несправядліва,—ня супакойваецца грамадзянка С.

— Справядліва ці несправядліва—гэта іншая справа, а што грошай у каапэратыве не аказалася, гэта верна.

Усіх выслухвае Міхаіл Іванавіч, усім дае той або іншы адказ.

І нічога дзіўнага, што за апошнія пяць год лік зьвяртаючыхся да М. І. Калініна павялічваецца з году ў год. У 1924 г. іх было 44.268; у 1925 г.—48.381; у 1926 г.—62.057; у 1927 г.—72.754; у 1928 г.—124.554.

За мінулы 1928 г. на першым месцы стаялі пытаньні непасрэдна датычныя вёскі—33,8 проц. усіх зваротаў, далей—пытаньні працы, лячэньня і матар'яльнае дапамогі—22,5 проц., аб памілаваньні—15,4 проц., аб звароце дамаўладаньняў—11,6 проц., аб пэнсіях—10 проц. і іншых—6,7 проц.

Асноўны склад зьвяртаючыхся, зразумела, сяляне—47 проц., рабочыя—17 проц., служачыя—12,1 проц., хатнія гаспадыні—4,5 проц., саматужнікі—2,5 проц., вучні і вайскова-служачыя—7 проц., іншыя групы—9,9 проц.

Як-жа вырашаліся паступіўшыя ў прыёмную справы ў мінулы год?

Па прыблізных, яшчэ папоўных падлічэньнях, з усіх спраў было: здаволена—7,1 проц., дадзена растлумачэньне—17,0 проц., перададзена на канчатковае вырашэньне ў іншыя ўстановы—45,8 проц., адхілена—24,5 проц., ня скончана—6 проц.

Па шэрагу найбольш важных спраў прыёмнай М. І. вядзецца падрабязнае расьсьледваньне. Вось, напрыклад, вынікі аднаго з такіх расьсьледваньняў.

У красавіку мінулага году сяляне вёскі Коннава, Бярозаўскай вольасьці, Ліхвінскага павету, Калускае губ., зьвярнуліся ў прыёмную са скаргаю на тое, што старшыня сельсавету няправільна разьмеркаваў насеньне канюшыны; што ён, як былы штабс-капітан,, не бароніць інтарэсаў беднаты. М. І. даручыў Калускай губ. РСІ зрабіць расьсьледваньне. Расьледваньнем пацьвердзілася грунтоўнасьць скаргі сялян: старшыня сельсавету Левачкін сапраўды былы штабс-капітан; справа аб злоўжываньнях перададзена ў пракуратуру, а сам Левачнін зьнят з працы.

Згодна прапановы М. І. Калініна было зроблена расьсьледваньне скаргі гр-н з Боева, Лева-Рассашанскай вол., б. Варонескага павету, аб няправільным вылічэньні самаабкладаньня, якое вывілася ў тым, што старшыня сельсавету не даабкладаў магутныя гаспадаркі, а павялічваў самаабкладаньне бяднацкіх гаспадарак.

Матар'ялам абсьледаваньня скарга пацьвердзілася, і Баеўскі сельсавет быў распушчан, з асьвятленьнем прычын перавыбараў перад насельніцтвам.

Таксама расьсьледваньнем пацьвердзіліся скаргі сялян б. Чэмбарскага павету аб няправільным выдаткаваньні б. Чэмбарскім павятовым выканкомам 6.000 р., безгаспадарчым выдаткаваньні 15.000 р. на рамонт дому імя Бялінскага, у выніку чаго дзевяць чалавек адказных працаўнікоў былі аддаены пад суд і атрымалі пакараньне ад году да 6 год.

Але бываюць выпікі і адваротнага парадку, калі асобныя грамадзяне прыносяць М. І. Калініну зусім безпадстаўныя скаргі з мэтаю дыскрэдытаваць мясцовую ўладу. Аднак, выпады такіх асоб лёгка выкрываюцца, як лёгка выкрываецца і сапраўдны твар такога «скаргшчыка». У большасці яны кулакі, або асобы з вельмі дрэнным мінулым.

Падалі гр. гр. А. Барсукоў і С. Ермакоў з в. Магільнік, Янутараўскага раёну, Цюменьскага павету, Уральскае вобласьці, скаргу на няправільнае адабраньне ў гр. Усьцюнава хлеба, здадзенага імі апошняму для хаваньня.

З матар'ялаў расьсьледваньня, зробленага згодна прапановы сэкратарыяту М. І. Калініна, было выяўлена, што гр. Усьцюгаў у пачатку 1928 г. быў засуджан за злосную спэкуляцыю па 107 арт. Крымінальнага Кодэксу да зьняволеньня, з канфіскацыяй маемасьці, з на папярэднім сьледзтве ён не паказваў, што ў яго схаваны чужы хлеб.

Але апроч

З ПАДРЫХТОЎКАЙ ДА СЯЎБЫ НЯ ЎСЮДЫ ДОБРА.

МАКСЫМУМ УВАГІ ПРАВЯДЗЕНЬНЮ МІНІМУМУ АГРАНАМІЧНЫХ МЕРАПРЫЁМСТВАЎ ПА ЎЗЬНЯЦЬЦІ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ

Пакуль пярун ня грукне...

У БССР у бягучым годзе чакаецца вялікі ўраджай садовіны. Вялікая колькасьць яе намячаецца да вывазу ў замежныя краіны. Зразумела, што трэба своечасова падрыхтавацца да рэалізацыі садовіны, да гэтае вельмі адказнае працы. Нажаль ёсьць яшчэ таварышы, якія прытрымліваюцца старой прыказкі:—„Цішэй едзеш, далей будзеш", якую яі ў якім выпадку нельга прыстасаваць да садовінае справы.

У прыватнасьці ў савгасных садох Беларусі чакаецца ўраджай яблык і ігруш каля 600.000 пуд. Вядомая справа, што трэба прыняць усе належныя меры да пакіданьня ўраджаю вранысловых садоў і ўласнай эксплёатацыі савгасаў, каб вырвать садовінны рынак з рук прыватніка-спэкулянта, дзеля чаго неабходна своечасова зрабіць умовы для продажу садовіны з дзяржаўнымі і кааперацыйнымі арганізацыямі, але мы назіраем поўную індыферэнтнасьць з боку нашай спажывецкай кааперацыі і інш., якія ня маюць жаданьня зрабіць умову з Белсельтрэстам на куплю садовіны загадзя.

Між тым, савгасы ня маючы сродкаў па нарыхтоўку тары, могуць напасьці ў блізвыхаднае становішча. Магчыма прапусьціць сэзон нарыхтоўкі тары, што павядзе да зрыву працы ці ў лепшым выпадку да правядзеньня працы ў непажаданым парадку, што таксама да дабра не давядзе. У мінулым годзе ня мала звадзіў савгасам Белселсаюз з куплею ўраджаю садовіны і, урэшце, адмовіўся ад купі яе ў цэнтралізаваным парадку, а сёлета ненк цягне Белдзяржгандаль. Ёсьць пастанова акругандлю, у якой значыцца, каб Менцерабкоп зрабіў умову з Белсельтрэстам на куплю садовіны яшчэ ў мінулым месяцы, але відавочна гэта яго не датычыцца.

Зразумела, што калі зімовая сьпячка будзе працягвацца ў гэткім-жа духу, дык мы прасьпім усё на сьвеце. Не пашкодзіла-б каб РСІ палячыла таварышоў, якія хварэюць на сонную хваробу, пакуль яна не абышлася дзяржаве ў капеечку.

Цяпер далей. Хутка будзе вясна. Хутка будуць прад'яўлены правы шкоднікам садоў, гародаў і інш. Мы шмат пішам прыгожых слоў аб барацьбе з шкоднікамі, але мала чаго пакуль што практычна ўжываем. Наша сельска-гаспадарчая кааперацыя на мясцох (ня ведаю як у цэнтры) зусім ня мае ці мае ў недастатковай колькасьці абпырсквацелянў. Прымаюцца ўсе меры да ўзьняцьця ўраджайнасьці, але ёсьць небясьпека, што ўраджай будзе зьнішчан ці значна папсаваны шкоднікамі, асабліва ў сялянскіх садох Трэба зрабіць усё магчымае да забясьпечаньня садоўніцтва і гародніцтва сродкамі барацьбы з шкоднікамі.

Янка ў Квадраце.

Падрыхтоўка ідзе добра.

(Гатаўскі с.-с., Самахвалавіцкага райёну).

Яшчэ ў лютым м-цы агульны сход сялян вёскі Гатава пастанавіў безадкладна прыступіць да ачысткі насеньня.

Праз тры дні пасьля гэтае пастановы ў сяло была дастаўлена з Новаўворскага семяннога т-ва зерначысьцілка «Трыумф», на якой ужо ачышчана 26 тон і 3 цэнтнэры яравога збожжа.

На гэтым тыдні павінен прыбыць у сяло трыер, на якім будзе ачышчана насеньне лёну і канюшыны.

Не адышлі ад Гатава і два другія буйныя селішчы—вёска Кацягі і вёска Чурылавічы, дзе таксама ачышчана ўсё яравое насеньне на трыеры, узятым гэтымі вёскамі з племхозу імя Калініна.

Добра рыхтуецца да вясеньняга севу і камітэт сялянскае ўзаемадапамогі. Зараз ім сабрана 446 пудоў зернавой запазычанасьці і ўзыскана 438 рублёў грошай, на якія КСУ пастанавіў закупіць 150 пудоў насеннага аўсу і сельска-гаспадарчыя машыны.

П. Ш.

Прафсаюзы Полаччыны рыхтуюцца сустракаць вясну.

Прафэсыйныя арганізацыі Полаччыны пачалі падрыхтоўку да сустрэчы вясеньняй пасеўкампаніі. Гэта пытаньне займае асаблівае мейсца сярод працоўных гораду.

Некалькі тыдняў таму назад пытаньне аб дапамозе вёсцы ў правядзеньні пасеўкампаніі і падвышэньні ўраджайнасьці нашых палёў ставілася на нарадзе старшынь усіх саюзаў, дзе былі выпрацаваны канкрэтныя мерапрыёмствы па гэтаму пытаньню.

21 сакавіка пытаньне аб дапамозе вёсцы стояла і займала належнае месца на пленуме акруговага бюро прафсаюзаў, дзе ўлічаны некаторыя недахопы і намечаны далейшыя мерапрыёмствы.

На пасяджэньнях праўленьняў саюзаў, рабчкомаў і мясцкомаў таксама былі распрацаваны гэтыя пытаньні. Там працоўныя ўнясілі канкрэтныя мерапрыёмствы па правядзеньню пасеўкампаніі і па ўзьняцьцю ўраджайнасьці.

Саюзнымі органамі пастаўлена пытаньне перад сваімі сябрамі, а таксама перад вайсковымі часткамі аб зборы попелу і аб своечасовай здачы яго кааперацыйным арганізацыям для ўгнаеньня пасеўнай плошчы. Прыняты меры да таго, каб сабраны попел быў захаваны і транспартаваны на месца прызначэньня.

Пастаўлена канкрэтна пытаньне перад саюзнымі арганізацыямі аб разгортваньні працы па лініі шэфкамісіі праз выезды асобных таварышоў, а таксама пасылку рабочых брыгад на больш доўгі тэрмін у вёску. Гэта робіцца сакзамі чыгуначнікаў, мэталістых, дрэвапрацоўнікаў, скурнікаў, краўцоў, хімікаў, друкароў і інш.

Дадзена дырэктыва, каб усе мерапрыёмствы па правядзеньню пасеўкампаніі былі шчыльна ўвязаны з працай партыйных, камсамольскіх і інш. арганізацый, працуючых па гэтай галіне.

Па саюзах савгандпслужачых, сельгаспрабочых і будаўнікоў праводзіцца растлумачыцельная работа па гэтай галіне. Сярод сельгаспрабочых праводзіцца праца па іх калектывізацыі і кааперараваньні.

Але неабходна адзначыць, што з боку некаторых саюзаў яшчэ ня праведзена пэўнага разуменьня правядзеньня гэтай кампаніі. Некаторыя таварышы яшчэ кажуць, што гэта ня наша справа. З гэтым бязумоўна праводзіцца рашучая барацьба.

С. Воцьлахім.

На „Карпілаўцы".

(*Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта*).

Адразу, што кінулася ў вочы ў Азарыцкім РВК, Мазырскае акругі, гэта «ветлівасьць» старшыні да наведвальнікаў.

І ня толькі да нас. У габінэце быў стары селянін. Ён раз-по-разу ўставаў з лаўкі і ўсё прасіў:

— Таварыш прэдсядацель... дапанажэце... я—батрак... член саюзу... беспрацоўны... няма сродкаў для існаваньня... Старшыня РВК супакойваў яго, ды ўсё прапанаваў!

— Сядайце, дзеду... сядайце...

А дзеду не сядзелася. Дзед прасіў дапамогі.

— Вось мая членская кніжка; з яе вы і ўбачыце, што я беспрацоўны...

У кніжцы было напісана: **Бохун Назар Д. Беларус. 1858 году радзіньня. Прафэсія—батран. Член саюзу з 23-га настрычніка 1928 году.**

— Вам, дзеду, дапамогі ня можам даць, бо ў вас прафсаюзны стаж, як батрака, з 1928 году. Ня можам даць дапамогу.

— То, як-жа, таварыш прадсядацель, я-ж галадаю, ні хаты, ні кала, ні двара ў мяне няма. Былі чобаты прадаў, а цяпер хіба лапці скінуць. І што-ж я вінават, што залічылі мяне ў саюз толькі ў канцы 1928 году. Я-ж батрачу ўжо 70 гадоў. Вы-ж самі аб гэтым добра ведаеце...

— Нічога, дзеду, ня будзе! Дапамогі вам ня можам даць.

— То як-жа таварыш прадсядацель... Я-ж ня маю чаго есьці...

— А вы-б, дзеду, венікі вязалі,—адказаў нарэшце гэты „ветлівы" старшыня РВК Бубліч.

Нарэшце, батрака накіравалі ў раённы камітэт сялянскай узаемадапамогі. Пашлі і мы за ім.

— А вы зноў у нас? Ах, гэты дзед! Даўся ён нам у знакі!

— На, дзед, рубель,—ды ідзі...

— Дзякую, дзякую вам.

СВАЯВОЛЬНАЯ ПАВОЛЬНАСЬЦЬ.

Мы-ж засталіся тут на пару хвілін ды пацікавіліся, як працуе раённы камітэт сялянскай узаемадапамогі.

— Пытаецеся, колькі пазыкі зьвяркута нам? Вельмі мала. **Трэба спагнаць выдадзенай насеннай пазыкі 3040 пудоў, а спагнана толькі на 15 сакавіка па 9 камітэтах узаемадапамогі—962 пуды і 1980 рублёў грашыма.**

Мы раздалі 926 пудоў, але яшчэ не сабралі. Пазыка гэта ўся—па сялянах.

— Трэба спагнаць членскіх узносаў 3309 руб., і нядоімкі мінулых гадоў 2973 руб., а спагнана толькі, як таго так і другога, 2 тысячы 521 руб.

Мы даведаліся, што ў РКСУ яшчэ няма сьпісаў сялян-бедняко ў, якім трэба дапамагчы ў вясеньнюю пасяўную кампанію, няма штучнага ўгнаеньня, насеньня для абсемяненьня бядняцкіх гаспадарак. Слаба ідзе кааперраваньне беднаты. Да вясны трэба было кааперраваць 356 чалавек, а кааперравана каля 200 (?).

Мы былі сьведкаю, калі з вёскі **Мыслаў-Рог**, у раённы камітэт сялянскай узаемадапамогі прышла бядняцка **Клімковіч Агапа.**

— Прышла, каб вы запісалі мяне ў сьпіс бедняко ў для атрыманьня хлеба праз кааперацыю, бо ў нашу вёску прыехаў гандлір з к. Парычы **Лякімовіч Гірш**, прадаціць па 4 рублі за пуд, і нам беднякам не дакупіцца.

І характэрна, што гэтую бядняцку Кабыльнічанскі камітэт сялянскай узаемадапамогі ня ўнёс у сьпіс беднаты, і зараз піша:

„Хадайнічаем перад РКСУ аб унясеньні ў наш ранейшы сьпіс гэтую бядняцку Клімковіч». Ня ведаем, ці запісалі бядняцку Агапу ў сьпіс бедняко ў. Мы гэтага не дачакаліся. Бядняцка сядзела ў СКСУ ды ўсё прасіла:

«Адпусьцеце мяне! Далёка ехаць».

* * *

«Няўважлівыя адносіны да голасу мас зьяўляецца найбольш небясьпечным праяўленьнем бюракратызму"... так запісана ў пастановах 4-ай усесаюзнай нарады рабселькораў.

Гэта мы спаткалі ў Азарычах. Даведаліся і на фактце перакананіся, што тут батракі ў загоне, што працы з імі ніякай не вядзецца, што ня ўсе батракі раённу ўзяты на вучот, што з імі абыходзяцца тут на першы погляд «ветліва», «уважліва», а сапраўды батракі, беднякі тут стаяць на другім пляне. Так не павінна быць!

Міхась Крук.

Пра попел і яго зборшчыкаў.

Алейны завод „Зара" першы ў Магілеве распачаў збор попелу і добра працягвае гэтую справу. А вось па суседзтву з ім знаходзіцца другі буйны завод «Пралетары» які толькі зьбіраецца выдаць адпаведны загад; тое-ж самае на заводзе імя Лекерта.

Але ад загаду да выкананьня—«дистанция огромного размера». Вось друкарня «Саха і Молат» ужо некалькі разоў давала «загад», але попелу пакуль што няма. Электрастанцыя лічыць «зборам» ссыпку попелу разам з розным брудам. А бетонны завод пастаніў скрыню пад страхою, адкуль льецца вада. Старшыня Магілёўскага райвыканкому лічыць ніжэй сваёй годнасьці праверыць, як зьбіраецца попел. Не паважае попелу загадчык складу заводу „Адраджэньне":—«хіба завод зьяўляецца прадпрыемствам па вытворчасьці попелу?» — кажа ён.

Каб не пакрыўдзіць іншыя нашы прадпрыёмствы і ўстановы, трэба сказаць, што няма збору попелу ў спраў доме, паштовай канторы (50 пячэй), своечасова пачалі зьбіраць попел і Сельгассаюз і Дняпросаюз.

Нельга не заўважыць на тое, што нідзе не заведзены бляшаныя скрынкі (нават у мэталёвым заводзе «Адраджэньне»), усюды—драўляныя. А гэта вядома, небясьпечна ў пажарных адносінах.

На вёсцы савгасы і большасьць калгасаў зьбіраюць попел. Да збору попелу часткі раённых устаноў ужо прыступілі (Клімавічы, Чырвонапольле), другая частка (Прапойск) яшчэ не раскачалася.

Квік.

Калектыў павінен быць арганізаваны.

(Азарыцкі раён, Мазыршчына).

Па Аварыцкаму раёну, як і па ўсёй Беларусі, беднота прагне да калектывізацыі сваёй гаспадаркі, да арганізацыі камун, арцелаў і калектываў.

Калі спрыяюча да гэтага адносяцца ў раёне, дык ня ўсе працаўнікі ў вёсцы зразумелі важнасьць перабудовы і гаспадарчай рэканструкцыі нашай беднай вёскі.

Напрыклад, у Хаміцкім сельсавеце летась беднота, абгаварваючы, між сабой пытаньне як палепшыць сваё становішча, парашыла аб'яднацца ў калектыў. Ад слоў перайшлі да справы. Адразу праведзен быў запіс беднаты, жадаючай арганізаваць калектыў.

Справа ішла добра, але раптам сяляне прыходзяць у сельсавет, а потым да агранома і кажуць:—выпішыце нас з калектыву;—ня хочам быць у ім. Прычына скора выкрылася. Кулакі павялі арганізаваны наступ супроць арганізаванага калектыву. Яны проста казалі беднаце:—„калі арганізуецеся ў калектыў, дык мы вас спалім".

Сельсавет, альбо партыйная ячэйка даведаўшыся аб прычынах развалу калектыву, не пакланаціліся нават даць арганізаваны адпор кулакам і, такім чынам, перамога за кулакамі.

Гэты факт трэба мець на ўвазе, бо з надыходам вясны сяляне ізноў загутараць аб камунах і калектывах. Зараз ужо маецца на мэце арганізаваць тры калектывы у раёне. Трэба беднату загадзя падрыхтаваць і дапамагчы ёй у перабудове старой вёскі.

Азарыцкі.

НЕДАРЭЧНАСЬЦІ У ПРАВЯДЗЕНЬНІ КАНТРАКТАЦЫІ.

Водлуг даных Наркамгандлю БССР, кантрактацыя пасеваў яравых культур у Шклоўскім раёне распачалася толькі з 15 сакавіка, папярэдняя растлумачальная кампанія аб задачах кантрактацыі па раёну не праводзілася, і толькі цяпер на сялянскіх сходах працаўнікі сельска-гаспадарчых таварыстваў, а ў дні адпачынку і працаўнікі райвыканкому знаёмяць насельніцтва з задачамі кантрактацыі і на месцы заключаюць дагаворы.

Замест леташніх асобных дагавораў заключаюцца групавыя, але разам з тым няма ніводнага дагавору, які быў-бы заключаны з цэлай вёскай. Напрыклад, з 30 прысутных на сходзе сялян падпісваюць дагавор аб кантрактацыі толькі 18 чалавек і пасьля подпісу некалькі сялян адмаўляецца ад кантрактацыі.

Трэба адзначыць зусім ненармальнае зьявішча, калі пры выдачы закантрактаванай гаспадарцы грашовага авансу частку грошай утрымліваюць на пай і г. д. Нават бываюць выпадкі, што з прычыны гэтага некаторыя гаспадаркі авансу грашыма зусім не атрымліваюць. Наогул, кантрактацыя пасеваў у некаторых мясцох зрабілася стымулам для сысканьня паёў у каапэрацыю і ўнясеньня ўкладаў. Неабходна прыняць меры да таго, каб селяніны, які кантрактуе свае пасевы, мог вольна распараджацца атрыманым авансам.

Назіраецца таксама на мясцох і такое ненармальнае зьявішча, што пасеўшчыкі па вытворчаму крэдытаваньню атрымліваюць ня сельска-гаспадарчыя машыны, ня штучнае ўгнаеньне і нават не насеньне канюшыны і вікі, а насеньне аўса і ячменю. Між тым сельска-гаспадарчыя таварыствы да гэтага пытаньня падыходзяць фармальна і кажуць, што такая была заяўка сялян, кантрактаваўшых пасевы.

Каб ня быць галаслоўным, прывядзём пару прыкладаў. Так, у в. Трэбушкі, Шклоўскага райёну, па сьпісу вытворчага крэдытаваньня с.-гасп. таварыства абавязалася выдаць 12 сялянам 108 пуд. аўса, а ў в. Вялікая-Камароўка 14 сялянам таварыства абавязалася выдаць 135 пуд. аўса, а ў абодвых выпадках толькі 2 грамадзянам па плугу, на штучнае-ж угнаеньне ніхто заяўкі не зрабіў. Наогул, заяўку на атрыманьне аўса робяць усе гаспадаркі ў сярэднім па 10 пуд. незалежна ад таго, ці кантрактуе гаспадарка 0,25 гакт. ці гэктар пасеваў.

Неабходна зараз-жа спыніць утрыманьне з авансаў, што выдаюцца сялянам-кантрактантам. Вытворчы крэдыт павінен у асноўным выдавацца штучным угнаеньнем, сельска-гаспадарчымі машынамі, насеньнем траў. Авёс і ячмень неабходна выдаваць толькі тым гаспадаркам, якія адчуваюць патрэбу ў пасеўным матар'яле і ў разьмеры, які патрэбен для пасеву.

Трэба адзначыць і тое, што на месцы як у раёне, гатак і ў акрузе мясцовыя працаўнікі, што праводзяць працу па кантрактацыі, якаснаму боку апошняй не аддаюць належнай увагі. Гэтыя працаўнікі лічаць, што калі кантрольная лічба па кантрактацыі выканана, значыць, праца зроблена. Гэтыя дэфэкты заўважаны ў працы Шклоўскага сельска-гаспадарчага таварыства, якое лічыцца адным з моцных. У іншых-жа таварыствах Магілёўшчыны і іншых округ ня толькі якасна, але і колькасна праца па кантрактацыі пастаўлена яшчэ горш.

Белсельсаюзу неабходна зараз жа камандыраваць у раёны кампетэнтных працаўнікоў для практычнага кіраўніцтва працай па кантрактацыі. Акрсельсаюзы таксама павінны паслаць на месцы сваіх працаўнікоў, але не для абсьледаваньня, як гэта звычайна назіраецца, а для практычнай дапамогі ў працы па правядзеньню кантрактацыі нізавымі сельска-гаспадарчымі таварыствамі.

Азьвярэлае кулаччо не сунімаецца.

(*Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта*).

ПРА ХАМІЧЫ ЎЖО ВЕДАЮЦЬ.

Пра вёску Хамічы, Калінкавіцкага райёну, ведаюць па ўсёй Мазырскай акрузе.

Спытайцеся па дарозе, едучы туды, у якога-небудзь селяніна.

— Дзядзька, ці далёка да Хамічоў?

— А вы ў Хамічы?

— Так, у Хамічы.

— Нясе вас туды ахвота,—кіне ў адказ нібы незнарок падарожны. Пакачае задумённа галавою, пукне на сваю канічку і як мага скарэй сёрыцца ў дарожнай далечыні.

Хамічы вядомы сваім кулацтвам, сваімі хуліганскімі нападамі на беднату. Тут мінулай вясною забілі бедняка Гарбача Пятра за актыўную работу па зямляўпарадкаваньні, за ўдзел у правядзеньні самаабкладаньня. Тут ужо ў працягу некалькіх год кулакі-хуліганы тэрарызуюць беднату. За кожнае мерапрыёмства беднаты кулаччо старацца адпомсьціць.

ВЯСЕНЬНЯЙ НОЧЧУ.

Др-др-др—кіямі па плоце. Дз-ы-н—пасыпалася шкла разьбітай шыбы. Звон шкла, ляскат кія па плоце перарвалі на час цішыню вясеньняй ночы.

Нібы жадаючы паглядзець, хто разбудзіў начны спакой, выглянуў з-за хмар месячык. Сваімі чыстымі вясеньнямі праменьнямі месячык асьвяціў п'яную, разьюшаную постаць хулігана Журава Пятра.

— Пусьці ў хату! Чуеш, пусьці а то дрэнна будзе—не супакойваўся Жураў.

— Калі-б ты з добрым намерам, дык пусьціў-бы, а ты-ж з кіем, з гвалтам.

— Пусьці кажу... Дай закурыць.

— Закурыць? То ідзі.

Скрыпнулі дзьверы. У хату ўваліўся Жураў.

— На вось, закуры,—кажа, седзячы ля стала бядняк Дзяніс Якушэнка.

—Закурыць? Хата твая хутка закурыць... Маць тваю... Ты пралетары, бядняк... Ты мне не—раўня... Чуеш, ты мне не раўня! Я падатак плачу, а ты вызвален. У-у!—разьюўся Жураў.

— Чаго ты людзей будзіш?—абазвалася Якушэнкава жонка.

— А, і ты? Заб'ю! І пачаў біць кабету.

Нарэшце, хулігана ўдалося выправадзіць з хаты. З пагрозамі, з лаянкай накіраваўся ён у абоймы ночы.

СОНЕЧНЫМ ДНЁМ.

Якушэнка рашыў падаць за хуліганства ў народны суд. Раніцою пашоў да настаўніка, каб напісаць заяву. Там яго сустрэла п'яная хеўра: Жураў Янка, Рыгор Гарбач, Іван, Мікола і Тарас Прусы жлуцілі самагон.

Угледзелі Якушэнка.

— А, ты-ткі сюды, то пачакай, мы табе дамо. Сам прышоў у нашы лапы.

— Я табе даў-бы, я цябе са стрэльбаю з-за вугла сустрэў-бы.

Бачачы такі настрой, Якушэнка пашоў дамоў.

У Якушэнкі на душы—ні кроплі радасьці. Вясною навесны сум. Як прыкра, балюча. У мінулым засталося батрацкае жыцьцё, жабрацтва. Панскія паганячы і рэдкі кавалак хлеба. Нядаўна парашыў сесьці на свой хлеб. Набыў зямліцы кавалачак. З гаспадаркай яшчэ не падняўся, як сьлед, на ногі. Дапамагае ўлада. Гарой стаіць за яе Якушэнка. Гэта яго—працоўнага ўлада, яна дала яму кавалак хлеба. На ўсе запатрабаваньні ён адклікаецца першым.

Але вось жыцьця няма за кулакамі, так і цкуюць. У задуменьні ён на прыкмеціў, як яго дагналі Янка і Міхась Прусы.

Бах бутэлькаю з самагонам па вуху. Раз ударыў і яшчэ намерваецца. Якушэнка наўцёкі, хуліганы за ім. Пугаўём Якушэнка разьбіў бутэльку, што яшчэ раз навісла над яго галавою. Бразь... Палящела шкло, паліліся прыкрая атрута. Прус схапіў палена і пакалечыў руку Якушэнку; але і гэтага мала: учапіўся Янка за горла, пачаў душыць. Хрыплыя густыя зыкі. Сударжны енк. Бязсільнае змаганьне бедняка з хуліганам.

Выбегла жонка, змоўк прыдушаны Якушэнка. Хуліган кінуў сваю першую ахвяру і пачаў паленам біць жонку бедняка. Крык, плач, енк. Сабраўся натоўп.

Ледзь ачуняў Якушэнка. Падняўся, каб бегчы ў сельсавет за дапамогаю. Зноў злазіў яго Янка Прус, зьбіў да няпрытомнасьці.

А натоўп стаяў, паглядаў, дзівіўся, рагатаў.

Зьбітага, акрываўленага выцягнулі Якушэнка з-пад хулігана.

БОСЫМ ДАБЕГ.

Пакінуўшы акрываўленую жонку і гаспадарку без дагляду, увесь зьбіты, з разадраным горлам Якушэнка бег у Дамнанавічы ў суд. Ніхто яму не дапамог у Хамічах.

15 кілёмэтраў, ня чуючы ног, не памятаючы дарогі, з жалем на сэрцы, з болем у горле бег ён у Дамнанавічы шукаць дапамогі. Кулацкая вёска на яго маленьні аб дапамозе не адгукнулася.

Па пакрытай лёдам дарозе бегчы цяжка. А Якушэнка бег не застанаўляючыся, баючыся нават азірнуцца. Так усю дарогу, 15 кілёмэтраў...

Ушчэнт парваліся пасталы (так тут называюць лапці), босымі нагамі ступаў ён па ледзяной дарозе. Вострыя голкі ледзь рэзалі ногі, мароз забіраўся далёка ў глыбіню пад старэнькі кажушок.

ЗА ШТО?

Бядняк Якушэнка ўвесь час у дарозе пытаў сябе.

— За што?

Адказ найсьці ня цяжка.

За два дні перад чарговай кулацкай расправай у Хамічах праводзілася самаабкладаньне. Сход даручыў Якушэнку падпісваць галасы. Сумленнасьць Якушэнкі ведалі ўсе. Яму даручылі маленькую справу. Свае абавязкі Якушэнка выканаў добра, сумленна. Больш 80-ці рук налічыў ён, якія падняліся за тое, каб самаабкладаньне ў вёсцы Хамічы правесьці на 15 процантаў грашыма і 10 проц. работай.

Трэба-ж пабудаваць школу. Досыць дзецям тулыцца па чужых хатах. Досыць наймаць памяшканьне пад школу ў кулакоў.

Вось за тое, што Якушэнка сумленна выконваў свае абавязкі, яго і пабілі кулакі.

— Чаму ты так мала налічыў галасоў супроць самаабкладаньня?—пыталася ў яго кулаччо.—Мы табе пакажам!—гаварылі яны на другі дзень.

Як відаць, над Якушэнкам кулаччо, ненавіта кулаччо, наладзіла сваю помсту.

ХУЛІГАНСТВА ЦІ КУЛАЦКАЯ ПОМСТА?

Ня можа быць і гутаркі, што ўся гэта справа—звычайнае хуліганства. Справа гэта—помста кулакоў. Кулаччо напаіла хуліганаў і падгаварыла іх забіць Якушэнка. Толькі так трэба кваліфікаваць гэтую брудную справу.

Два чарговыя напады на бедняка-актывіста не павінны так абыйсьціся для кулацкай групы вёскі.

Сьледчым органам трэба як найхутчэй высьветліць гэтую справу; трэба як належыць пакараць хуліганаў—кулацкіх наймітаў. Трэба раз назаўсёды адвучыць хамічкае кулацтва ад замахаў на беднату.

Янка Паўлоўскі.

Пачалася гарачая „касавіца"

(ЛІСТ УДЗЕЛЬНІКА ПАХОДУ «САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ»).

На шчасьце—і надвор'е спрыяе вялікай справе паходу—першаму паходу ў глухія куткі Беларусі—у Мазыршчыну і Случчыну,—арганізаванаму рад. газ. «Савецкая Беларусь». Нечаканыя замаравкі далі магчымасьць бяз лішніх турбот перавезьці друкарскую машыну са станцыі Гарочыцы ў вёску.

Сяляне з ахвотай дапамагалі выгрузіць увесь важкі багаж—машыну, шрыфт і г. д., чакаючы з нецярплівасьцю пабачыць «тое», што «так хораша роўненька піша і праз невялікі тэрмін часу можа выпусьціць у сьвет некалькі тысяч нумароў газэты ці кніжак».

„СВАЕ АБАВЯЗКІ ВЕДАЕМ"...

— Як ня ведаць, што трэба рабіць у такім разе, калі да нас у вёску, з цэнтру, прыехала «Савецкая Беларусь»? Бязумоўна, ведаем,—кажуць дзядзькі-сяляне—ведаем таму, што многія з нас пішуць у газэты.

Пачалася сапраўдная пабудова газэты. Пачалі сыпацца, як мак са жмені, пачкамі допісы ад сялян, прычым большасьць з іх упяршыню пішуць у газэту наогул.

З-пад крытычнага вока селяніна не ўцячэ ніводзін факт. У першым нумары, а за ім праз два дні і ў другім, выпушчаных у в. Гарочыцы—паходнай «Савецкай Беларусьсю» можна чытаць пра кааперацыю ў Гарочыцах, якая замест антырэлігійнай працы займаецца продажам выключна кашэрнага мяса, дзеля чаго нанята спэцыяльнага разьніка (не хапала яшчэ равіна!), якому плаціць 70 рублёў у месяц і які рожа ў працягу месяца 5-7 кароў.

У гэтай кааперацыі ёсьць любімчыкі (пазбаўленыя права голасу), якія бяруць тавары ў неабмежаваным ліку...

У гэтых 2-х нумарох можна знайсьці пра праступную дзейнасьць загадчыка лесазаводам і млынам-Фралова і пра тое, што Мазырскі Камтрэст у працягу 4-х год не загляне да Фралова, быццам лесазавод ня іх.

Нішуць таксама і пра партыйца Р. Дразда, які выходзіць з калгасу, і многа іншых розных фактаў...

ХАДАКІ АТАКОЎВАЮЦЬ РЭДАКЦЫЮ.

Не пасьпела рэдакцыя разьвінуць яшчэ прывезеная маемасьці, як сяляне з далёкіх і блізкіх вёсак прышлі са скаргамі і за парадамі. За 4 дні ў рэдакцыі пабывала каля 300 сялян.

Знача, пачынаецца гарачая «касавіца»,—з ухмылкай кажа адзін селянін.—А касіць ёсьць што. Шмат непарадкаў назіраецца ў нас. У кааперацыі і наогул у раённых установах...

Трэба, трэба скасіць парасткі непатрэбнага шкоднага зельля...

Выказаўшы свой погляд, што патрэбна практыкаваць часьцей падобныя выезды, селянін пачынае сваю асабістую справу.

У аднаго раённая зямельная камісія адабрала вучастак зямлі, якім ён карыстаўся у працягу 10-ці год, адабрала як незаконна захопленую ў той час, калі дакумэнты сьведчаць, што зямля атрымана праз належныя ўстановы. Гэту пастанову акруга пацьвердзіла. Зараз справа ў Вышэйшай Земкамісіі, але, ня гледзячы на гэта селяніну прапанавалі ў працягу месяца аслабаніць вучастак, перанесьці будоўлю (хату, хлявы і г. д.), каб «пылу ня было»...

У другога дзядзькі бяда—сажа (галаўня) ў жыце завялася.

— Як быць, як пазбавіцца ад гэтага нячыстага зельля?—пытае ён,—і хлеб чорны, гаркавы, ну, і ўраджай вядомы—што кот наплакаў...

— А ў нас у Гарочыцах калектыў арганізаваўся, ды нешта ня клеіцца ніяк «сьпіцы ў калёсы падстаўляюць...».

ПАРТЫЕЦ ДРОЗД СУПРОЦЬ КАМУНЫ І КАЛЕКТЫВУ.

Рэдакцыя не аставіла бяз увагі ніводнай сялянскай скаргі, ніводнага запытаньня.

Зацікавіліся бліжэй справай развалу калектыву ў в. Гарочыцах. Аказалася, што ў мінулым годзе беднота з Гарочыц задумала арганізаваць камуну.

Яны выбралі самую вышэйшую форму аб'яднаньня сваіх гаспадарак з тым, каб рашуча адразу палепшыць сваё жыцьцё і прытым беднота ўгаварыла ўступіць аднаго партыйца Дразда, які «культурна» пачаў весьці гаспадарку (мае сэпаратар, тры каровы, наогул не бяднак).

Выбралі Дразда ўпаўнаважаным, сабралі крыху грошай і накіравалі яго ў райён. Дрозд варочаецца праз нейкі час з новай думкай і кажа: «Ведаеце, даражэнькія, памойму лепш арганізаваць калгас, чым камуну...

— Ну калі калгас, дык калгас—згадзіліся сялянне: Дрозд-жа партыец—лепш за нас ведае.

Згадзіліся арганізаваць калгас, бо абрыдла век векаваць у жабрацтве і голадзе.

Арганізаваліся, статут прынялі, пачалі афармляцца канчаткова, чакаючы зямляўпарадкаваньня.

А Дрозд тым часам, прыкрываючыся імем калгасьніка і партыйца, пашыўся ў Менск на курсы агнятрывалага будаўніцтва, наказаўшы сваёй жонцы ні ў якім разе ў калектыў ня ўступаць.

Такім чынам, па міласьці Дразда, камуна (а потым і калектыў) развалілася.

Рэдакцыя зрабіла спэцыяльна некалькі сходаў, гутарак, выпусьціла насьценную газэту, прысьвечаную калектывізацыі.

ХОМІЦКІХ СЯЛЯН ПЕРАКАНАЛІ.

Пытаньне аб правядзеньні самаабкладаньня ў Беларусі адышло на 2-гі плян, бо самаабкладаньне даўно праведзена. Зараз прыступілі да збору і выкарыстоўваньня сродкаў па намечанаму пляну.

Але ў глухім мазырскім кутку, у Лінаўскім сельсавеце, наконт самаабкладаньня справа абстаіць ня зусім так, як у многіх беларускіх вёсках. Напрыклад, у в. Хомічы заможная частка, якая плаціць 100-150 руб. падатку, праваліла сход па самаабкладаньню, праваліла і тады, калі прыяжджалі прадстаўнікі з Калінкавіцкага райвыканкому, райкому партыі і нават з акругі.

Хамівіцкія заможнікі трымаюць у «чорным целе» беднату і верхаводзяць у такіх пытаньнях, як самаабкладаньне.

У часе вандраваньня па Лінаўскаму сельсавету выязная рэдакцыя „Савецкай Беларусі", трапіўшы ў вёску Хамічы, даведалася аб гэтым. І вось 21 сакавіка на агульным сходзе, дзе прысутнічала ўся вёска, усплыло зноў пытаньне аб самаабкладаньні. Беднота, убачыўшы, што цэнтральная газэта за іх, што цэнтральная газэта дбае аб паляпшэньні дабрабыту вёскі, падняла сотню рук, прыняўшы такім чынам самаабкладаньне.

МАШЫНА ПА ЧЫСТЦЫ ЎСТАНОЎ.

З Гарочыц выязная рэдакцыя пераехала ў Дамнанавіцкі і Лінаўскі сельсаветы, а адтуль праз тыдзень у новы райён—Азарыцкі.

Ужо загадзя ў Азарычы выехаў адзін з таварышоў, каб прысутнічаць на спэцыяльна скліканай раённай канфэрэнцыі рабселькораў, падрыхтаваць іх да ўдзелу ў выпуску газэты і дапамагчы прыцягнуць у гэту справу ўсю вясковую беднату.

Прыезд прадстаўніка ад выязной газэты толькі ўпэўнае ў тым, што сапраўды «Савецкая Беларусь» арганізавала вандроўную рэдакцыю і друкарню, і для іх гэта зусім ня нова, бо сялянства ўжо добра ведае, дзеля чаго мы прыехалі ў Мазыршчыну.

Праўда, ведаюць многія аб выязной рэдакцыі, але ня ўсе аднолькава.

У Азарычах, напрыклад, можна было чуць такія размовы:

— Вы чулі?!

— Пакуль што нічога. А што?

— Як што? Рэдакцыя „Савецкай Беларусі" прыяжджае, чыстку ўстаноў праводзіць будзе. Вось што.

Як гэта чысьціць?

— Ну, калі ты і гэтага ня ведаеш, дык знача зусім ад жыцьця адстаў зусім... Чысьціць будуць вельмі проста. Рэдакцыя вязе машыну вагою ў 200 пудоў, едуць мэханікі. Кожнага працаўніка будуць асаблівым сьветам з гэтай машыны прасьвячаць наскрозь, будуць бачыць усё яго нутро, і калі чалавек ня наш, не савецкі, знача вон яго з установы...

—Ну, калі так, дык знача кааператара з нашай вёскі абавязкова вычысьцяць, бо ён, бачыш, лічыцца батраком, а на справе—заможнік. Мае шмат зямлі, некалькі штук кароў ваўпачоску і інш.

На раённай нарадзе рабселькораў рэдакцыя гэтыя чуткі аб машыне пастаралася разьбіць, растлумачыўшы сапраўдную мэту свайго прыезду.

Невялічкая, калі ня лічыць мястачковых жыхароў, па ліку раённая канфэрэнцыя, якая ўпяршыню за ўсе гады сабралася, вітаючы першы пачын „Савецкай Беларусі", абяцала дапамагчы ў справе прыцягненьня працоўнага сялянства да ўдзелу ў аглядавай газэце.

НАШЫ НАВЕДВАЛЬНІКІ.

У пачатку гэтага лісту ёсьць ужо аб тым, што ў вёсцы Гарочыцах рэдакцыю наведала каля 300 сялян; гэтак сама і ў другіх пунктах, куды часта выяжджаюць працаўнікі рэдакцыі:

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Беларускае ССР

аб зьмене пастановы ЦВК і СНК БССР за 17 мая 1928 году пра парадак выданьня акруговымі і раённымі выканаўчымі камітэтамі і гарадзкімі саветамі абавязковых пастаноў і пра накладаньне адміністрацыйных пакараньняў.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

Зрабіць у пастанове Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР за 17 мая 1928 г. «Пра парадак выданьня акруговымі і раённымі выканаўчымі камітэтамі і гарадзкімі саветамі абавязковых пастаноў і пра накладаньне адміністрацыйных пакараньняў за іх парушэньне» (З. З. БССР 1928 г., № 17, арт. 160) наступныя зьмены:

1. Запісаць пункт „а" артыкулу 2 у наступнай рэдакцыі:

«а) у справе грамадзкага парадку і бясьпекі: пра парадак адчыненьня і дзейнасьці месц для відовішчаў і гульняў, прадпрыемстваў грамадзкага карыстаньня, гасьцініц, начлежных дамоў, лазьняў, цырульняў, сталовак, растаранаў, чайных, а таксама трамваяў, аўтабусаў, аўтамабіляў, пра парадак і правілы руху па вуліцах і плошчах, пра забарону паказвацца на вуліцы і ў іншых публічных месцах у п'яным відзе, пра парадак дашпчэньня і рэгуляваньня фурманнага промыслу, устанаўленьня месц, часу і парадку гандлю ў крамах, на кірмашох, рынках і іншых месцах для гандлю, пра абавязковае вывешваньне ўсімі гандлёвымі і прамысловымі прадпрыемствамі шыльдаў, пра парадак падліку зьмен у насельніцтва, пра парадак разьмяшчэньня праходзячых вайсковых частьцей»;

2. Да пункту „б" артыкулу 2 пасьля слоў „пра змаганьне з пошасьцямі" дадаць словы: «з шаленствам хатняй жывёлы».

3. Да пункту „г" артыкулу 2 пасьля слоў «водапроводаў і водасьцёчных труб» дадаць словы: «пра ўстанаўленьне парадку нарыстаньня водою з прыватных студняў».

4. Запісаць артыкул 8 у наступнай рэдакцыі:

«8) абавязковыя пастановы гарадзкіх саветаў могуць скасоўвацца вышэйшымі над імі выканаўчымі камітэтамі. Абавязковыя пастановы раённых выканаўчых камітэтаў могуць скасоўвацца акруговымі выканаўчымі камітэтамі, а акруговых—Саветам Народных Камісараў альбо Прэзыдумам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту».

5. Запісаць артыкул 9 у наступнай рэдакцыі:

«9) Пракуроры падаюць пратесты: на незаконныя абавязковыя пастановы гарадзкіх саветаў тым выканаўчым камітэтам, якім гэтыя саветы падпарадкаваны, на абавязковыя пастановы раённых выканаўчых камітэтаў—у акруговыя выканаўчыя камітэты, а Пракуратура Рэспублікі — на абавязковыя пастановы акруговых выканаўчых камітэтаў—у Савет Народных Камісараў.

Гэтыя пратесты павінны вырашацца ў тэрміновым парадку".

6. Пункт «б» артыкулу 13 запісаць у наступнай рэдакцыі:

«б) за наступныя парушэньні:

1) за няплату паасобнымі грамадзянамі ўпяршыню ва ўстаноўлены тэрмін падатку альбо збору на абавязковым акладным страхаваньні, калі ёсьць магчымасьць заплаціць іх і калі былі ўжыты адміністрацыйныя меры для іх спагнаньня;

2) за адмаўленьне ўпяршыню паасобных грамадзян ад выкананьня агульна-дзяржаўных павінасьцяй і работ;

3) за выраб, збыт, куплю альбо хаваньне без належнага дазволу агнястрэльнай палаўнічай зброі і агнястрэльных набояў да яе;

4) за невыкананьне альбо парушэньне пры будаўнічых работах устаноўленых пастановамі органаў улады будаўнічых, санітарных альбо супрацьпажарных правіл, калі гэтыя дзеяньні па моці цяжкіх вынікаў;

5) за парушэньне правіл аховы народнага здароўя апроч вышэйказ., прадугледжаных артыкулам 112 Крымінальнага Кодэксу, а таксама за парушэньне правіл барацьбы з эпізоотыямі;

6) за непаданьне ва ўстаноўлены тэрмін старшынямі праўленьняў кааперацыйных таварыстваў і працоўных арцеляй і іх аб'яднаньняміі, прадстаўнікамі ўсялякіх таварыстваў, якія маюць гандлёва-прамысловыя мэты, а таксама паасобнымі прадпрыемствамі зьвестак аб рабоце прадпрыемстваў, іх вытворчасьці, зьменах у асабовым складзе таварыстваў і інш., паводле ўстаноўленых цэнтральнаю і мясцоваю ўладаю правіл і форм;

7) за парушэньне законаў і правіл аб гандлі і прамысловасьці, калі за парушэньне іх устаноўлена адказнасьць у адміністрацыйным парадку;

8) за парушэньне правіл хаваньня дакумэнтаў, якія павінны быць аплачаны гэрбавым зборам, і правіл хаваньня гандлёвых кніг, а таксама за непаданьне дакумэнтаў і кніг службовым асобам у выпадках устаноўленых дзейнічаючымі пастановамі;

9) за самавольную парубку ў лясох гульнадзяржаўнага і мясцовага значэньня, таксама за парушэньне правіл для аховы ясоў ад крадзяжу і зьнішчэньня, калі шкода ад гэтых дзеяньняў па ўстаноўленых таксах не перавышае пяцьдзесят рублёў;

10) за выраб, хаваньне і збыт самагону, а таксама за выраб, хаваньне, рамонт і збыт апаратаў, якія спэцыяльна прызначаны для выробу самагону, апроч выпадкаў, прадугледжаных артыкуламі 149 і 150 Крымінальнага Кодэксу;

11) за няўку ў тэрмін у вызначанае судовымі альбо адміністрацыйнымі органамі месца пражываньня і за самавольнае часовае пакіданьне гэтага месца, а таксама за невыкананьне асобамі, высланымі ў судовым альбо адміністрацыйным парадку, устаноўленых правіл рэгістрацыі такіх асоб;

12) за карыстаньне чужымі дакумэнтамі для рэгістрацыі ў адрасным стале альбо для пасьведчаньня свае асобы перад органамі ўлады;

13) за пашэньне асобамі, ня маючымі на гэта права, устаноўленай форменнай вопраткі, а таксама ўстаноўленых адметных знакаў, апроч паказаных у артыкуле 114 Крымінальнага Кодэксу;

14) за парушэньне правіл аб парадку адчыненьня і эксплёатацыі друкарняў, літаграфій і іншых паліграфічных прадпрыемстваў, а таксама майстэрняў, якія займаюцца вырабам эмблемаў, штампаў, адметных знакаў і падобных да іх;

15) за парушэньне правіл, устаноўленых для размнажэньня і выпуску ў сьвет надрукаваных твораў, а таксама правіл фотокіна-цэнзуры;

16) за пабудову прыватнай радыё-станцыі—прыймальнай, перадатачнай і прыймова-перадатачнай без належнай рэгістрацыі альбо дазволу, а таксама за карыстаньне такою радыё-станцыяй без аплаты абанэмэнту альбо з парушэньнем правіл карыстаньня і правіл кантролю;

17) за парушэньне альбо перашкоду рэлігійнымі абрадамі альбо культавымі цэрэманіямі вольнасьці руху іншых грамадзян наперакор закону ці загадам органаў улады;

18) за паданьне непраўдзівых зьвестак у заявах, (якія падаюцца ў дзяржаўныя ўстановы ці службовым асобам ва ўстаноўленых законам выпадках пры рэгістрацыі альбо адчыненьні гандлёва-прамысловых прадпрыемстваў і ўстаноў, жыльлёвых і іншых таварыстваў;

19) за адчыненьне дзейнасьці таварыстваў раней рэгістрацыі іх статутаў і, наогул, запарушэньне ўстаноўленага законам парадку;

20) за зьнішчэньне, псаваньне, знос альбо перамяшчэньне знакаў, якія ўжываюцца пры вядзеньні зьёмчаных, астрэнома-геодэзычных і нівэліровачных работ (слупы акруговых меж, рэперы, піраміды і інш.), а таксама за пастаноўку новых такіх знакаў там, дзе яны не павінны быць».

7. Запісаць артыкул 14 у наступнай рэдакцыі:

«14. Акруговыя выканаўчыя камітэты за парушэньне выданых імі абавязковых пастаноў маюць права назначаць на тэрыторыі акруговага гораду штрафы на больш за 100 рублёў альбо прымусовыя работы на больш як на адзін месяц; на тэрыторыі неакруговых гарадоў з насельніцтвам больш за 5.000 чалавек—штраф ня больш 50 р. альбо прымусовыя работы ня больш як на два тыдні; на тэрыторыі гарадоў з насельніцтвам менш за 5.000 чалавек, а таксама на тэрыторыі сельскіх і местачковых саветаў—штраф ня больш за 10 рублёў альбо прымусовыя работы ня больш як на 4 дні.

Раённыя выканаўчыя камітэты за парушэньне выданых імі абавязковых пастаноў маюць права назначаць штрафы на тэрыторыі сельскіх і местачковых саветаў ня больш 3 рублёў альбо прымусовыя работы ня больш як на два дні.

Гарадзкія саветы за парушэньне выданых імі абавязковых пастаноў маюць права назначаць на тэрыторыі акруговых гарадоў штрафы ня больш за 100 руб. альбо прымусовыя работы ня больш як на 1 м-ц, на тэрыторыі неакруговых гарадоў з насельніцтвам больш за 5.000 чалавек—штраф ня больш за 50 руб. альбо прымусовыя работы ня больш як на два тыдні і на тэрыторыі гарадоў менш за 5.000 чалавек—штраф ня больш 10 руб. альбо прымусовыя работы ня больш як на 4 дні.

За парушэньне, паказанае ў пункце «б» арт. 13, а калі ў адпаведным законе не ўстаноўлен гранічны разьмер штрафу, то і за парушэньні, паказаныя ў пункце «в» таго-ж самага артыкулу, накладаецца адміністрацыйнае пакаранньне да 100 рублёў штрафу, альбо да аднаго месяцу прымусовых работ, паводле артыкулу 20 гэтае пастановы».

8. Запісаць артыкул 19 у наступнай рэдакцыі:

«19. Адміністрацыйныя пакараньні па пратаколах за парушэньне абавязковых пастаноў маюць права накладаць: а) на тэрыторыі акруговых гарадоў—прэзыдыум гарадзкога савету беспасрэдна альбо праз начальніка адміністрацыйнага аддзелу акруговага выканаўчага камітэту; б) на тэрыторыі неакруговых гарадоў — прэзыдыум гарадзкога савету; в) на тэрыторыі сельскіх мясцовасьцяй — прэзыдыум местачковага альбо сельскага савету».

9. Запісаць артыкул 20 у наступнай рэдакцыі:

«20. Адміністрацыйныя пакараньні за парушэньні, пералічаныя ў пунктах «б» і «в» арт. 13 гэтае пастановы, накладаюцца ў сельскіх мясцовасьцях і на тэрыторыі местачковых саветаў толькі прэзыдыумам раённага выканаўчага камітэту, на тэрыторыі неакруговых гарадоў — прэзыдыумамі гарадзкіх саветаў альбо прэзыдыумамі раённых выканаўчых камітэтаў, а ў акруговых гарадох—прэзыдыумам гарадзкога савету беспасрэдна альбо праз начальніка адміністрацыйнага аддзелу акруговага выканаўчага камітэту.

Пры гэтым: а) пры парушэньнях, прадугледжаных абзацам 3 пункту «б» артыкулу 13, незаконна набытая зброя і агнястрэльныя прылады да яе канфіскуюцца, б) пры парушэньнях, прадугледжаных абзацам 4 пункту „б"артыкулу 13, набудаваньня з парушэньнем будаўнічых і санітарных правіл будынкі зачыняюцца альбо зусім разбіраюцца, в) пры парушэньнях прадугледжаных абзацам 9 пункту «б» артыкулу 13, здабыты з парушэньнем закону лесаматар'ял канфіскуецца, а пры невыяўленьні гэтага лесаматар'ялу спагнаяецца ў адміністрацыйным парадку кошт яго паводле ўстаноўленых таксаў, г) пры парушэньнях, прадугледжаных абзацам 10 пункту «б» артыкулу 13, знойдзеныя самагон і апараты канфіскуюцца».

10. Запісаць артыкул 25 у наступнай рэдакцыі:

«25). Калі паказаныя ў папярэднім артыкуле тэрміны, прадугледжаныя абзацамі 4,9 і 10 пункту «б» арт. 19, будуць прапушчаны, то ўжываюцца ў адміністрацыйным парадку толькі меры, паказаныя ў другой частцы артыкулу 20».

11. Запісаць артыкул 30 у наступнай рэдакцыі:

«30. Службовыя асобы за злоўжываньне і за перавышэньне ўлады пры накладаньні адміністрацыйнага пакараньня прыцягваюцца да адказнасьці паводле артыкулу 196 і 197 Крымінальнага Кодэксу».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

23 лютага 1929 г. г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров Белорусской ССР

об изменении постановления ЦИК и СНК БССР от 17 мая 1928 года о порядке издания Окружными и Районными Исполнительными Комитетами и Городскими советами обязательных постановлений и о положении административных взысканий.

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

Внести в постановление Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров от 17 мая 1928 года „О порядке издания окружными и районными исполнительными комитетами и городскими советами обязательных постановлений и о положении административных взысканий за их нарушение" (С. З. БССР 1928 г. № 17, ст. 160) следующие изменения:

1. Изложить пункт «а» статьи 2-ой в следующей редакции:

„в) по вопросам общественного порядка и безопасности: о порядке открытия и действия мест для зрелищ и игр, предприятий общественного пользования—гостиниц, ночлежных домов, бань, парикмахерских, столовых, ресторанов, чайных, а также трамваев, автобусов, автомобилей, о порядке и правилах движения на улицах и площадях, о запрещении появляться на улицах и в других публичных местах в пьяном виде, о порядке допущения и регулирования извозного промысла, установления мест, времени и порядка торговли в лавках, на ярмарках, рынках и других местах торговли, об обязательном вывешивании всеми торговыми и промысловыми предприятиями вывесок, о порядке учета изменения населения, о порядке размещения проходящих воинских частей».

2. В пункте „б" статьи 2 после слов: «о борьбе с эпидемиями" добавить слова: «с бешенством домашних животных».

3. В пункте „г" статьи 2 после слов: «водопроводов и водосточных труб» добавить слова: «об установлении порядка пользования водой из частных колодцев".

4. Изложить статью 8-ую в следующей редакции:

„8) Обязательные постановления городских советов могут отменяться высшими над ними исполнительными комитетами. Обязательные постановления районных исполнительных комитетов могут отменяться окружными исполнительными комитетами, а окружных—Советом Народных Комиссаров или Президиумом Центрального Исполнительного Комитета».

5. Изложить статью 9 в следующей редакции:

„9) Прокуроры вносят протесты: на незаконные обязательные постановления городских советов тем исполнительным комитетам, которым эти советы подчинены, на обязательные постановления районных исполнительных комитетов—в окружные исполнительные комитеты, а Прокуратура Республики—на обязательные постановления окружных исполнительных комитетов—в Совет Народных Комиссаров.

Эти протесты должны разрешаться в срочном порядке".

6. Пункт «б» статьи 13-ой изложить в следующей редакции:

„б) за следующие нарушения:

1) за неплатеж отдельными гражданами впервые в установленный срок налогов или сборов по обязательному окладному страхованию при возможности уплатить их, если были приняты административные меры для их взыскания;

2) за отказ впервые отдельных граждан от исполнения общегосударственных повинностей и работ;

3) за выработку, сбыт, куплю или хранение без соответствующего разрешения огнестрельного охотничьего оружия и огнестрельных припасов к нему;

4) за неисполнение или нарушение при строительных работах установленных постановлениями органов власти строительных, санитарных или противопожарных правил, если эти деяния не имели тяжелых последствий;

5) за нарушение правил народного здравоохранения, кроме случаев, предусмотренных статьей 112 Уголовного Кодекса, а также за нарушения правил борьбы с эпизоотиями;

6) за непредставление в установленный срок председателями правлений кооперативных товариществ и трудовых артелей и их об'единениями, представителями всяких обществ, имеющих торгово-промышленные цели, а также отдельными предприятиями сведений о работе предприятий, их производительности, изменениях в личном составе обществ и прочем, согласно установленных центральной и местной властью правил и форм;

7) за нарушение законов и правил о торговле и промышленности, если за нарушение их установлена ответственность в административном порядке;

8) за нарушение правил хранения документов, кои должны оплачиваться гербовым сбором, и правил хранения торговых книг, а также за непред'явление документов и книг должностным лицам в случаях, установленных действующими постановлениями;

9) за самовольную порубку в лесах общегосударственного и местного значения, а также за нарушение правил по охране лесов от расхищения и уничтожения, если вред от этих действий по установленным таксам не превышает пятидесяти рублей;

10) за выработку, хранение и сбыт самогона, а также за выработку, хранение, ремонт и сбыт аппаратов, специально предназначенных для выработки самогона, кроме случаев, предусмотренных статьями 149 и 150 Уголовного Кодекса;

11) за неявку в срок в указанное судебными или административными органами место проживания и за самовольное временное оставление этого места, а также за неисполнение лицами, высланными в судебном или административном порядке, установленных правил регистрации таких лиц;

12) за пользование чужими документами для регистрации в адресном столе или для удостоверения своей личности перед органами власти;

13) за ношение лицами, не имеющими на это право, установленной форменной одежды, а также установленных отличительных знаков, кроме указанных в статье 114 Уголовного Кодекса;

14) за нарушение правил о порядке открытия и эксплоатации типографий, литографий и других полиграфических предприятий, также мастерских, занимающихся выделкой эмблем, штампов, отличительных знаков и тому подобных;

15) за нарушение правил, установленных для размножения и выпуска в свет напечатанных произведений, а также правил фото-кино-цензуры;

16) за постройку частной радио-станции-приёмной, передаточной и приёмно-передаточной без надлежащей регистрации или разрешения, а также за пользование такой радио-станцией без оплаты абонемента или с нарушением правил пользования и правил контроля;

17) за нарушение или стеснение религиозными обрядами или культовыми церемониями свободы движения других граждан, вопреки законам или распоряжениям органов власти;

18) за предоставление неправильных сведений в заявлениях, подаваемых в государственные учреждения или должностным лицам в установленных законом случаях, при регистрации или открытии торгово-промышленных предприятий и учреждений, жилищных и других товариществ;

19) за открытие действия товариществ, ранее регистрации их уставов и вообще с нарушением установленного законом порядка;

20) за уничтожение, порчу, снятие или перемещение знаков, употребляемых при производстве с'ёмочных, астрономично-геодезических и нивелировочных работ (столбы окружных границ, реперы, пирамиды и проч.), а также за установку новых таких знаков там, где они не должны находиться.

7. Изложить статью 14 в следующей редакции:

«14. Окружные исполнительные комитеты за нарушение изданных ими обязательных постановлений имеют право назначать на территории окружного города—штрафы не более 100 рублей или принудительные работы не более одного месяца; на территории неокружных городов с населением больше 5.000 человек—штраф не более 50 рублей или принудительные работы не более двух недель—, на территории городов с населением менее 5.000 человек, а также на территории сельских и местечковых советов—штраф не более 10 рублей или принудительные работы не более четырех дней.

Районные исполнительные комитеты за нарушение изданных ими обязательных постановлений имеют право назначать штрафы на территории сельских и местечковых советов не более 3 рублей или принудительные работы не более двух дней.

Городские советы за нарушение изданных ими обязательных постановлений имеют право назначать на территории окружных городов штрафы не больше 100 руб. или принудительные работы не более одного месяца;—на территории неокружных городов с населением более 5000 человек—штраф не более 50 рублей или принудительные работы не более двух недель и на территории городов менее 5000 человек—штраф не более 10 рублей или принудительные работы не более четырех дней.

За нарушения, указанные в пункте „б" ст. 13, а если в соответствующем законе не установлен предельный размер штрафа, то и за нарушения, указанные в пункте «в» той-же самой статьи, налагается административное взыскание до 100 рублей штрафа или до одного месяца принудительных работ, на основании статьи 20 настоящего постановления".

8. Изложить статью 19 в следующей редакции.

«19). Административные взыскания по протоколам за нарушения обязательных постановлений имеют право налагать: а) на территории окружных городов—президиум городского совета непосредственно или через начальника административного отдела окружного исполнительного комитета; б) на территории неокружных городов—президиум городского совета, в) на территории сельских местностей—президиум местечкового или сельского совета».

9. Изложить статью 20 в следующей редакции:

«20) Административные взыскания за нарушения, перечисленные в пунктах «б» и «в» статьи 13 этого постановления налагаются в сельских местностях и на территории местечковых советов только президиумами районных исполнительных комитетов, на территории неокружных городов—президиумами городских советов или президиумами районных исполнительных комитетов, а в окружных городах—президиумом городского совета непосредственно или через начальника административного отдела окружного исполнительного комитета. При этом: а) при нарушениях, предусмотренных абзацем 3 пункта «б» ст. 13-й, незаконно приобретенное оружие и огнестрельные припасы к нему конфискуются, б) при нарушениях, предусмотренных абзацем 4 пункта «б» ст. 13-й, возведенные с нарушением строительных и санитарных правил постройки закрываются или совсем разбираются, в) при нарушениях, предусмотренных абзацем 9 пункта «б» ст. 13-й, добытый с нарушением закона лесоматериал конфискуется, а при невыявлении этого лесоматериала взыскивается в административном порядке стоимость его, согласно установленных таксе, г) при нарушениях, предусмотренных абзацем 10 пункта «б» ст. 13-й, обнаруженный самогон и аппараты конфискуются».

10. Изложить статью 25 в следующей редакции:

«25) Если указанные в предыдущей статье сроки по делам о нарушениях, предусмотренным абзацами 4, 9 и 10 пункта «б» статьи 19, будут пропущены, то применяются в административном порядке только меры, указанные во второй части статьи 20».

11. Изложить статью 30 в следующей редакции:

«30) Должностные лица за злоупотребление и превышение власти при наложении административного взыскания привлекаются к ответственности по статьям 196 и 197 Уголовного Кодекса».

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР М. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич

23 февраля 1929 г.
г. Минск.

Час адабраць кандыдатаў у АБВШ.

Яшчэ да гэтага часу належныя арганізацыі не зварачваюць увагі пытаньню—адбору кандыдатаў у вайсковыя школы. Часта гэтая кампанія праходзіць з спазьненьнем. Вылучаныя кандыдаты прыходзяць у школы непадрыхтаванымі.

Такім адносінам да гэтага пытаньня ў гэтым годзе мы павінны палажыць канец. Трэба зараз-жа прыступіць да вылучэньня кандыдатаў у вайсковыя школы з такім разьлікам, каб з 1 красавіка ўжо можна было пачаць плянавую падрыхтаўку кандыдатаў па спэцыяльных праграмах. Усіх кандыдатаў трэба вызваліць ад усялякай грамадзкай нагрузкі і даць магчымасьць рыхтавацца да паступленьня ў АБВШ.

Вопыт мінулых гадоў паказвае, што найбольш каштоўная частка кандыдатаў па сацыяльнаму становішчу, як рабочыя, батракі і беднякі, бывае слаба падрыхтавана для паступленьня ў АБВШ, асабліва па агульна-адукацыйных дысцыплінах у выніку чаго ім бывае цяжка здолець праграму навучаньня. Вядома, што такі курсант, які слаба адчувае сябе па агульна-адукацыйных дысцыплінах, ня можа прымаць актыўны ўдзел у на-зашкольнай працы, не набывае адпаведных навыкаў у кіраўніцтве пазашкольнай працы і будучы ўжо камандзірам адчувае адпаведную свайго асобнага навучаньня.

Трэба адзначыць, што дрэнна абстаіць справа з клясавым адборам кандыдатаў у вайсковыя школы. У мінулым годзе мы мелі выпадкі, што ў АБВШ папала некаторая частка чужога нам, варожага элементу, якія пры паступленьні ў АБВШ прадстаўлялі даведкі ня толькі ад савецкіх, а нават ад партыйных і камсамольскіх арганізацый.

Гэта сьведчыць аб тым, што некаторыя мясцовыя партыйныя і прафесыянальныя арганізацыі вусім безадказна падыходзілі да клясавага адбору кандыдатаў у вайсковыя школы. У гэтым годзе, калі клясавая барацьба абвастрылася, мы павінны асабліва ўвагу зьвярнуць гэтаму пытаньню. Трэба кожную вылучаную кандыдатуру абгаварыць ня толькі на пасяджэньнях камісій, але і на агульных масавых сходах. Для гэтае меты неабходна скарыстаць насьцепныя і акруговыя газэты.

Пытаньню клясавага адбору кандыдатаў у вайсковыя школы мы павінны зьвярнуць максімум увагі. Трэба памятаць, што ў гэтым годзе мы павінны набраць ня менш 60 проц рабочых, ня менш 60 проц. камсамольцаў, а сярод сялянскай часткі кандыдатаў павінна быць ня менш 50 проц батракоў і беднякоў.

Гэтую задачу мы зможам вырашыць толькі тады, калі зараз-жа пачнём шырокую кампанію па вылучэньню кандыдатаў і ўцягнем у гэту працу шырокія колы рабочых і працоўнага сялянства.

А. Лопаёў.

ХРОНІКА.

У прэзыдыуме ЦСПСБ.

Узмацніць кампанію ашчаднасьці.

Прэзыдыум ЦСПСБ, заслухаўшы даклады саюзу харчавікоў, друкароў і саўгандпрацаўнікаў аб ходзе кампаніі 2-хтыднёвіка ашчаднасьці, адзначыў, што саюзамі на выканана дырэктыва ЦСПСБ па гэтым пытаньні. Усім ЦП саюзаў запрапанавана ўзмацніць працу па правядзеньню кампаніі ашчаднасьці.

Усебеларуская прамысловая нарада жанчын.

У красавіку пры жанаддзеле ЦК КП(б)Б адбудзецца Усебеларуская прамысловая нарада жанчын. Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў выклікаць на гэту нараду 12 жанчын, якія працуюць на прафэсійнай працы.

Абслугоўваньне койданаўскіх беспрацоўных мэталістаў.

У м. Койданаве налічваецца да 30 чалбеспрацоўных членаў саюзу мэталістаў, якія нікім не абслугоўваюцца. Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў гэтых беспрацоўных прымацаваць да саюзу крэсаванраценачнікаў, а ЦП саюзу мэталістаў запрапанавана адпусканць сродкі на іх абслугоўваньне.

Напярэдадні курортнай кампаніі.

Прэзыдыум ЦСПСБ абгаварыў даклад Галоўсанстраху аб выніках санаторна-курортнай кампаніі мінулага году і плян правядзеньня яе ў бягучым годзе.

Летась па лініі Галоўсанстраху было паслана на курорты 596 чалавек (па ўсёй БССР), а сёлета будзе паслана звыш 600. ЦСПСБ зацьвердзіў разьмеркаваньне курортных месц паміж акругамі БССР.

Побач з гэтым выказана пажаданьне, каб са скарачэньнем пабудовы санаторыя імя «10-хгодзьдзя БССР» лік месцаў у ім быў даведзены да 250. Прафсаюзам і страхкасам запрапанавана прыняць усе меры да поўнага скарыстаньня месцаў у дамах адпачынку. Пастаноўлена абавязаць прафсаюзы прасачыць за тым, каб на менш 10 проц. усіх месцаў на курортах было скарыстана для рабочай моладзі, занятай на вытворчасьці, і 15 проц. месцаў у дамах адпачынку.

На дапамогу вясеньняй сяўбе.

— ЦП саюзу сувязі дало дырэктыву ў сім працаўнікам саюзу прыняць самы актыўны ўдзел у правядзеньні вясеньняй сяўбы. Усе літаносцы і газэтаносцы павінны рас паўсюджваць на вёсцы літаратуру і лістоўкі аб сяўбе. Гарадзкія служачыя саюзу наросувязі будуць арганізоўваць спэцыяльныя брыгады для выезду на вёску.

— Рабочыя-чыгуначнікі МБВ арганізуюць 2 пераовачныя майстэрні, якія ў працу месяца будуць папраўляць дармова с-г. інвэнтар і машыны бяднейшаму сялянству.

— Рабочыя заводу „Дрэвапрацовачнік" пастанавілі адпрацаваць дзень на нарысьць вясеньняй сяўбы падшэфнай вёскі. Мае быць сабрана 1000-1200 руб., якія пойдуць на набыцьцё вятрэбных машын і прылядаў.

— ЦП Азэту пастанавіла ўзмацніць аграпрапаганду ў яўрэйскіх вёсках. Дзеля гэтага будзе выпушчана аднадзённая газэта. Ячэйкі на месцах атрымалі дырэктыву дапамагаць арганізацыі яўрэйскім калгасам у сялібе, як: Шацкай, сялібе Утель і Педзішчы і т-ваў па грамадзкай апрацоўцы зямлі ў Шчорыне і Коўчыцах.

25 проц. зарплаты — у касу ашчаднасьці.

На агульным сходзе працаўнікоў рэдакцыі і канторы газэты «Савецкая Беларусь» адзінадушна вырашана стаць усім укладчыкамі касы ашчаднасьці.

Сход даручыў канторы газэты «Савецкая Беларусь» з 1 красавіка 25 проц. зарплаты кожнага супрацоўніка ўносіць на імя апошняга ў касу ашчаднасьці.

Арганізацыя нацыянальных саветаў.

Да гэтага часу ў БССР было арганізавана 66 нацыянальных саветаў. Сёлета яшчэ арганізаваны 4 нацсаветы: Малькаўскі-літоўскі, Аршанскай акругі, Гроўскі і Ляднінскі—яўрэйскія і Акопскі—украінскі, Мазырскай акругі.

Усе 70 нацсаветаў падзяляюцца так: 25 яўрэйскіх, 19 польскіх, 16 расейскіх, 4 латышскія, 1 літоўскі, 3 украінскіх і 2 нямецкія.

Пераход яўрэяў на зямлю

ЦП Белавэту ў хуткім часе распачынае рэгістрацыю ўсіх яўрэяў, якія жадаюць перайсьці на зямлю. Пераселеньне на зямлю прадбачыцца як у межах БССР, так і ў Крым і Біра-Біджан.

Праверка жыльлёвага пляцу.

29-га сакавіка пры камгасе адбыўся сход рабочых брыгад, якія будуць праводзіць абсьледаваньне правільнага выкарыстоўваньня жыльлёвага пляцу ў камунальных, жактаўскіх і прыватніцкіх дамох. Для кіраўніцтва ўсёй гэтай працай вылучан штаб з 9-ці асоб з удзелам начальнікаў аддзяленьняў міліцыі і раённых загадчыкаў камгасаўскіх дамоў.

Сысканьне пратэрмінаваных пазык.

У другім квартале бягучага году па Меншчыне павінна было паступіць пратэрмінаваных пазык 850000 руб., а да 10 сакавіка паступіла толькі 521000 руб. або 61 проц. заданьня.

Менскі акрвыканком запрапанаваў райвыканкомам і сельска-гаспадарчым кредытным таварыствам прыняць меры да сысканьня запазычанасьці да 1 мая.

Растратчыкаў—пад суд.

Пры рэвізіі Койданаўскага райвыканкому высьветлілася растрата дзяржаўных грошай, яную зрабілі загадчык фінчастці Дарэйка і бухгальтар Костка.

Гэтыя «працаўнікі» растрацілі агулам звыш 5000 руб. Злачынцы арыштаваны, наложан арышт на іх маемасьць.

Менскі акрвыканком запрапанаваў пракуратуры паскорыць вядзеньне сьледзтва па гэтай справе.

2-тыднёвік аховы здароўя дзяцей

Менская акруговая інспэкцыя Нарасьвета ты сумесна з акрадпаравай в 10 красавіка будзе праводзіць 2-тыднёвік аховы здароўя па ўсіх навучальных установах сацыяльнага выхаваньня Менскай акругі. Двухтыднёвік ставіць мэтай палепшэньне санітарнага стану ўстаноў сацвыху.

СУДЗЬДЗІ-ХАБАРНІКІ.

Учора ў Вярхоўны Суд паступіла з пракуратуры Рэспублікі справа па абвінавачаньні б. судовых працаўнікоў Віцебскага акругі ў хабарніцтве і дыскрэдытацыі ўлады. У справе фігуруюць тры народныя судзьдзі: Саўлевіч, Луп'янаў і Ніколаеў, сакратар народу Матліцкі, загадчык земельнай часткай б. Кузьнецкоўскага РВК, а потым народзьдзя Калесьнікаў,—якім прад'яўляецца абвінавачаньне па 207-б і 212 арт. арт. КК, і інструктар - рэвізор Віцебскага акруговага суду.

Мысьліцкі, якому прад'яўлена абвінавачаньне па 207-б арт. КК, і 38 прыватных асоб, якія давалі хабары судзьдзям ці былі пасрэдникамі ў іх хабарніцтвах.

Справа мае тры томы—звыш 1200 старонак; на ёй выклікаецца 90 сьведак.

Падрабязнасьці справы будуць зьмешчаны ў адным з наступных нумароў нашае газэты.

Папраўка.

У нумары № 69 (2558) нашае газэты ў надрукаванай пастанове Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту ўкралася памылка: у п. 2 надрукавана: Койданаўскі раён пахаці 47, а павінна быць 37.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 30-3-29 г.

	Куп.	Прад.
1-я 6 проц. залатая выйгрышная пазыка	4—84	—
2-я 6 проц. залатая выйгрышная пазыка	5—00	—
Бясправ. пазыка 26 г.	122—	—
	124—	—
10-проц. Дзярж. выйгрышная пазыка 27 г.	25—42	25—52
6-я дзяр. індустрыял.	25—86,5	25—96,5
3-я сялянская 1927 г.	5—00	—
12-проц. рэнтн. 1927 г.	103—92	—
2-я пазыка індустрыял. проц. вып.	26—29	26—39.
2-я індустрыял. бясправ.	25—91	26—01.
11 унутран.	100—85	100—90

Апавяшчэньні.

У нядзелю, 31 сакавіка, а 6 гадзіне ўвечары ў аудыторыі 32 (Земляробскі завулак) адбудзецца пасяджэньне юрыдычнай сэкцыі навуковага таварыства пры БДУ.

На павестцы:

Даклад праф. Шыраева на тэму: „Рэфармаваньне крымінальна-працэсуальнага кодэксу ў РСФСР".

Сёньня, а 6 гадзіне ўвечары у вясковым аддзеле АК КП(б)Б (апагабінэт імя Ку К. Маркса) адбудзецца нарада ўсіх арганізацый і устаноў, праводзячых і прымаючых удзел у правядзеньні вясеньняй пасяўной кампаніі, па пытаньню праверкі выкананьня дырэктыў АК. На нараду запрашаюцца: Караневўскі, Казан, Пыжыкаў, Гасьпярскі, Каплан, Войтовіка, Платун, Кузнер, Баранчык, Белюсь, Макарэвіч, Аўчыньвікаў (Белсельтрэст), Сьцапанаў, Грушневўскі, Канавеіч.

У нядзелю, 31 сакавіка, а 11 гадзіне раніцы, у памяшканьні Камвузу адбудуцца чарговыя заняткі Нядзельнага Камвузу, на якіх т. Аур'е прачытае лэкцыю на тэму: «Тэорыя імпэрыялізму».

УСЕ ЯЧЭЙКІ МОПР'У

З 1-га красавіка атрымліваюць членскія білеты і маркі не ў райкомах Мопру, а ва ўсіх паштовых канторах, аддзяленьнях і агентствах БССР за гатоўку.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

Водгукі на карэспандэнцыі.

ПУШКІН УЗЯТ ПАД ВАРТУ.

У допісе «Художнік Пушкін», зьмешчаным у № 248 за 26-X—28 г. паведамлялася, што ў Клімавічах быў загадчыкам пардому нейкі Пушкін, які, арабіўшы там шэраг скандалаў і антысэміцкіх выпадаў, перакачаваў у Горкі і апынуўся на пасадзе загадчыка кіно-тэатру Сельска-Гаспадарчай Акадэміі.

ПК РСІ паведамляе, што Пушкін быў прыняты на пасаду загадчыка кіно на падставе водыву Клімавіцкага РВК і гарсавету.

Зараз ён зьняты з працы, прыцягнуты да суховае адказнасьці за злоўжываньні на ранейшай пасадзе і знаходзіцца ў напраўчым доме.

СПРАВА АБ ФЭРМЕ ПРЫЛУКІ-АТОЛІНА СПЫНЕНА.

Па сутнасьці допісу „Безгаспадарчасьць на вопытна-па